БЯСЦЭННЫЯ ЎРОКІ НАШАЙ ГІСТОРЫІ

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Для многіх з нас 7 лістапада — дарагое сэрцу свята, сімвал працоўнага гераізму першых пяцігодак, воінскага подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны, яркіх дасягненняў ва ўсіх сферах жыцця грамадства пасляваенных гадоў.

Звяртаючыся да мінулага, мы атрымліваем з яго бясцэнныя ўрокі. Маральныя ідэалы, якія дапамагалі нашым папярэднікам пераадольваць любыя цяжкасці і перамагаць у самых складаных абставінах, не страчваюць сваёй актуальнасці і сёння. Паколькі перад нашай краінай стаяць маштабныя задачы: значна павысіць якасць жыцця, стварыць эканоміку ведаў і новых тэхналогій, забяспечыць канкурэнтаздольнасць Беларусі ў свеце.

Мы будуем сацыяльна арыентаваную дзяржаву, у аснове якой — павага да людзей працы, ідэалы роўнасці і сацыяльнай справядлівасці, імкненне да ўзаемаразумення і яднання ў імя дабрабыту нашай Радзімы.

Шчыра жадаю вам, дарагія суграмадзяне, здароўя, шчасця і поспеху ва ўсіх добрых пачынаннях.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

7 ЛІСТАПАДА 2015 г. СУБОТА № 216 (28074) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАМ ЁСЦЬ ШТО АДСТОЙВАЦЬ І ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА

Учора адбылася цырымонія ўступлення на пасаду зноў абранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі

На цырымоніі прынясення прысягі з нагоды ўступлення на пасаду кіраўніка дзяржавы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў сваёй прамове агучыў прыярытэты ўнутранай і знешняй палітыкі незалежнай Беларусі.

Упершыню цырымонія інаўгурацыі праходзіла ў Палацы Незалежнасці. Урачыстасць адбывалася згодна з адпаведным пратаколам. Картэж Аляксандра Лукашэнкі ў суправаджэнні ганаровага эскорту з 7 матацыклістаў прыбыў да Палаца Незалежнасці. Прэзідэнт па дывановай дарожцы, уздоўж якой выстраіліся ваеннаслужачыя роты ганаровай варты, прайшоў да цэнтральнага ўвахода Палаца Незалежнасці. Пад гукі фанфар Аляксандр Лукашэнка праследаваў у залу ўрачыстых цырымоній Палаца Незалежнасці, прайшоў на ўстаноўлены тут подыум, дзе ўжо знаходзіліся старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч, старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, старшыня Вярхоўнага суда Валянцін Сукала, старшыня Канстытуцыйнага суда Пётр Міклашэвіч, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына.

Ваеннаслужачыя пад гукі ўрачыстага маршу ўнеслі на подыум Дзяржаўны сцяг, штандар Прэзідэнта і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Цырымонію ўступлення на пасаду Прэзідэнта адкрыла Лідзія Ярмошына. Яна аб'явіла рашэнне Цэнтрвыбаркама і запрасіла Аляксандра Лукашэнку да прынясення прысягі.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт уступае на пасаду пасля прынясення прысягі наступнага зместу: «Заступаючы на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, урачыста клянуся верна служыць народу Рэспублікі Беларусь, паважаць і абараняць правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, захоўваць і абараняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, свята і добрасумленна выконвацьускладзеныя на мяне высокія абавязкі». Паклаўшы правую руку на Канстытуцыю, Аляксандр Лукашэнка прачытаў прысягу на беларускай мове.

Далей Аляксандр Лукашэнка падпісаў акт аб прынясенні прысягі, пасля чаго старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына ўручыла яму пасведчанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Цырымонія інаўгурацыі адбылася ў прысутнасці больш як 1 тысячы запрошаных, сярод якіх найвышэйшыя службовыя асобы, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, кіраўнікі розных узроўняў, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, замежныя госці.

Ад імя Нацыянальнага сходу Аляксандра Лукашэнку з уступленнем на пасаду Прэзідэнта Беларусі павіншаваў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч. «Беларускі народ — адзіны носьбіт дзяржаўнай улады — чарговы раз адкрыта і сумленна, у поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам выбраў Вас кіраўніком дзяржавы. У гэтым шчырая ацэнка народам Вашай працы, Вашых пастаянных клопатаў аб простым чалавеку», — сказаў старшыня Савета Рэспублікі.

Акрамя таго, звяртаючыся да Прэзідэнта Беларусі, ён падкрэсліў: «Вы стварылі незалежную Беларусь — дзяржаву, паважаную ў свеце, у якой жыве беларускі народ. Мы ганарымся, што жывём у гэтай краіне». Спікер таксама падкрэсліў, што давер, аказаны Аляксандру Лукашэнку з боку народа, сведчыць аб гістарычнай місіі і высокай адказнасці Прэзідэнта.

ВЫСОКАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДА

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго перапаўняе пачуццё гонару за з'яднанае грамадства, за мільёны землякоў — грамадзян свабоднай Беларусі. «У час праведзенай кампаніі па выбарах кіраўніка дзяржавы наш народ чарговы раз прадэманстраваў усяму свету высокую палітычную культуру, адзінства перад тварам знешніх выклікаў і незалежнасць поглядаў. Нас не раз'ядналі ў мінулым, не ўдалося гэта цяпер і, я абсалютна ўпэўнены, ніколі не ўдасца зрабіць у будучыні», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што «шматлікія наглядальнікі, і нашы, і замежныя, маглі пераканацца ў тым, што ўся выбарчая кампанія прайшла спакойна, адкрыта, у строгай адпаведнасці з беларускім заканадаўствам». Усім кандыдатам былі прадастаўлены шырокія магчымасці для агітацыі.

Аляксандр Лукашэнка ад усяго сэрца падзякаваў суайчыннікам, усім тым, хто падтрымаў яго кандыдатуру. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта не асабісты поспех, а агульнанацыянальная перамога. «Гэта перамога беларускага народа. Падкрэсліваю, без усялякай ліслівасці: упершыню за ўсе перадвыбарныя кампаніі гэта была тая, назіраючы за якой, і я, і ўсе вы ганарыліся самі сабой і нашым народам, — сказаў Прэзідэнт. — Народ спакойна, ціха, адкрыта прыйшоў і паказаў, хто гаспадар у гэтым доме. У гэтым велізарная заслуга беларускага народа. І я ганаруся служыць гэтаму народу».

«У няпросты гістарычны момант народ прадэманстраваў з'яднанасць, масава прыняўшы ўдзел у выбарах. Сваімі галасамі людзі выказалі прыхільнасць да той унутранай і знешняй палітыкі, якую мы праводзім вось ужо больш як два дзясяткі гадоў», — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка.

Фота БЕЛТА.

Ён заўважыў, што гэтая палітыка не дасталася ў спадчыну. «Тады былі зусім іншыя выклікі, мы жылі ў вялікай краіне, якая магла дыктаваць усяму свету ўмовы існавання і ўраўнаважваць яго. Сёння іншыя выклікі, і нам часам адным даводзілася фарміраваць гэтую ўнутраную і знешнюю палітыку, дзесьці спатыкаючыся, дзесьці натыкаючыся на перашкоды, але мы не хлусілі, мы ніколі нікога не падманвалі. Мы ішлі сваім шляхам, і гэты шлях паказаў правільнасць нашых дзеянняў. Значыць, нашы намаганні не дарэмныя. Нам сапраўды ёсць што адстойваць сёння і чым ганарыцца», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

«Праведзеныя выбары чарговы раз даказалі самым розным сілам, у тым ліку па-за межамі нашай краіны: стаўка на сілавы захоп улады ў Беларусі шляхам «каляровых рэвалюцый» і «плошчаў» правальная! Гэтага ніколі не будзе!» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі «па-ранейшаму ёсць жменька, сапраўды жменька, палітыкаў, якія жадаюць распаліць агонь унутранай смуты».

«Характэрна, што такіх радыкалаў не прымае не толькі пераважная большасць народа, але нават і тая зусім невялікая частка людзей, якая не падзяляе пэўныя стратэгіі ўлады. Гэта значыць, што іх ідэалогію нават іх прыхільнікі не прымаюць», — канстатаваў Прэзідэнт.

ЦАНА РЭФОРМАЎ

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што занадта шмат сёння гавораць і пішуць аб рэформах. «Пры гэтым ніхто не гаворыць, што менавіта яны з сябе ўяўляюць», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Калі хтосьці за рэформы, то будзьце сумленнымі і скажыце, што трэба зламаць палітычны лад, дзяржаўнае ўладкаванне Беларусі, трэба раздзяліць, разрэзаць дзяржаўную народную ўласнасць і раздаць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Да гэтых рэформаў нас штурхаюць, і за гэтыя рэформы хтосьці сёння ў свеце гатовы шмат заплаціць».

Кіраўнік дзяржавы заклікаў прыхільнікаў рэформаў сумленна сказаць, што яны прадугледжваюць павышэнне пенсійнага ўзросту, увядзенне платнай медыцыны, адукацыі і гэтак далей.

Прэзідэнт упэўнены, што трэба задацца пытаннем, ці патрэбны краіне такія рэформы.

СТАР. 2

■ Меркаванні

ХВАЛЮЮЧАЯ ПАДЗЕЯ ДЛЯ КОЖНАГА

Парламентарыі, вядомыя грамадскія дзеячы і палітолагі, замежныя госці выказваюць сваё меркаванне наконт галоўнай палітычнай падзеі мінулага дня.

Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

— Інаўгурацыя прайшла ў вельмі ўрачыстых умовах, гэтая падзея была хвалюючай для кожнага, хто там прысутнічаў. Увогуле, сама падзея — сведчанне таго, што пераважная большасць жыхароў нашай краіны давярае дзеючаму Прэзідэнту і таму курсу дзяржаўнага развіцця, які ў нас рэалізуецца. Сёння ўжо ёсць генеральная лінія развіцця краіны на наступныя пяць гадоў. У выступленні Прэзідэнта яскрава прасочваўся клопат пра кожнага грамадзяніна нашай дзяржавы. Увага была акцэнтавана на якасці адукацыі, медыцыны. Была пастаўлена галоўная задача — мы павінны забяспечыць годны ўзровень жыцця людзей. У той жа час Прэзідэнт заўважыў: мы многага дамагліся разам. Гаворачы пра будучыню, кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў, што неабходна пабудаваць новую эканоміку — інавацыйную і эканоміку ведаў, заснаваную на высокіх тэхналогіях. Аляксандр Лукашэнка асобна спыніўся на знешнепалітычных пытаннях — краіна і надалей будзе надаваць прыярытэтную ўвагу інтэграцыйнаму супрацоўніцтву, найперш у рамках Саюзнай дзяржавы, Еўразійскага эканамічнага саюза.

Што да рэформаў, то, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, вельмі важна быць паслядоўнымі ў гэтым пытанні. Перш чым праводзіць глабальную рэформу, неабходна рэфармаваць саміх сябе, тады і будучыня — у нашых руках.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

— Сённяшняя інаўгурацыя прадэманстравала, што Беларусь — спакойная краіна, у якой людзі ведаюць, чаго хочуць: яны выбралі шлях, пры якім дзяржава сапраўды будзе абараняць народ.

У сваім выступленні Прэзідэнт заклікаў не супыкаць Беларусь з Усходам і Захадам. У нас ёсць свае нацыянальныя інтарэсы, мы зацікаўлены ў наладжванні адносін з тымі, хто жадае з намі супрацоўнічаць. Нам не патрэбны спрэчкі, канфлікты з суседзямі. Хацелася б, каб гэта пачула кіраўніцтва ўплывовых краін.

Рэспубліка Беларусь хоча быць рэальным, а не толькі геаграфічным цэнтрам Еўропы, мостам паміж Усходам і Захадам, а не месцам сутыкнення. У гэтым сэнсе ўкраінскі вопыт непрымальны для нашай краіны. Беларусь павінна стаць пляцоўкай для кааперацыі, прымірэння.

Ергалі БУЛЕГЕНАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі:

— Пераканаўчая перамога Аляксандра Лукашэнкі на выбарах сведчыць аб поўнай падтрымцы народам свайго лідара і яго палітыкі. Вядома, у свеце няпростая сітуацыя, і, нягледзячы на гэта, той беларускі шлях, які акрэсліў ваш Прэзідэнт, у гэтых умовах найбольш рэальны і вядзе да росквіту.

У Беларусі і Казахстана склаліся адносіны стратэгічнага партнёрства. У многіх інтэграцыйных аб'яднаннях мы выступаем ініцыятарамі, таму планы на будучыню вельмі вялікія. Сітуацыя няпростая: у свеце крызіс. Але ўсё зменіцца, я аптыміст у гэтым плане. Да 2025 года ўсе пытанні, якія павінны вырашыцца (па поўным адкрыцці нашых межаў для тавараў, рабочай сілы), застануцца ў мінулым. І Еўразійскі эканамічны саюз стане аб'яднаннем, якое мае значную вагу ў свеце. Калі ЕАЭС запрацуе ў поўную сілу, ён ператворыцца ў адно з самых магутных міждзяржаўных аб'яднанняў.

Андрэа ВІКТАРЫН, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі:

— У Беларусі і Еўрасаюза ёсць агульныя інтарэсы, якія выяўляюцца ў сумесных праектах. Яны тычацца як абароны навакольнага асяроддзя, так і іншых сфер. Бакі працягнуць развіваць адносіны па тых напрамках, у якіх яны зацікаўлены, і будуць прыкладаць для гэтага сумесныя намаганні.

Мне камфортна працаваць у Беларусі, і я вельмі рада зноў прыехаць у краіну. Раней я ўжо працавала ў Беларусі, у 2000—2003 гадах, і імкнулася вярнуцца да вас. Я шчаслівая, што знаходжуся тут. Мне падабаецца назіраць, як вы развіваецеся, падабаюцца вашы людзі. Уражвае, наколькі за час маёй адсутнасці змяніўся Мінск. Спадзяюся, у мяне будзе час паглядзець усю краіну.

Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь:

— Беларусь упэўнена абрала курс на далейшае развіццё незалежнасці і суверэннасці. Народ падтрымаў праводзімую Аляксандрам Лукашэнкам палітыку, перавыбраўшы яго на прэзідэнцкіх выбарах. У людзей ёсць упэўненасць у будучыні, і гэтая будучыня — у мірным і стабільным развіцці краіны.

Самае галоўнае, што ў цэнтры праводзімай Прэзідэнтам палітыкі знаходзіцца чалавек і ўсё ў краіне робіцца для дабрабыту людзей. У рэспубліцы ўкараняюцца самыя сучасныя тэхналогіі, у тым ліку інфармацыйныя, дзякуючы якім усе змаглі ўбачыць у прамым тэлеэфіры найважнейшую падзею — інаўгурацыю Прэзідэнта Беларусі — і адчуць дачыненне да гэтага мерапрыемства. Беларусы ганарацца сваёй краінай, у тым ліку маладое пакаленне, за якім — будучыня Беларусі.

Леанід КУЧМА, колішні Прэзідэнт Украіны:

— Гледзячы на сітуацыю ў Беларусі, хацеў бы пажадаць такой стабільнасці Украіне. Яна пайшла па такім шляху, па якім нікому не жадаю пайсці ў будучыні. Мінск стаў тым месцам, дзе былі закладзены асновы ўрэгулявання канфлікту ва Украіне. Я маю на ўвазе ў першую чаргу адвод цяжкіх відаў узбраенняў. Мяне радуе тое, наколькі за апошнія гады змянілася беларуская сталіца. Кожны раз, калі прылятаю ў Мінск, пачынаючы з аэрапорта, я атрымліваю велізарнае задавальненне, гледзячы наўкола. У тыя гады, калі я быў Прэзідэнтам Украіны і часта бываў у Мінску, гэты горад быў іншым. Ён змяніўся. Вы павінны ганарыцца тымі пераўтварэннямі, якія адбываюцца ў вашай краіне.

Чжун ШАНЬ, спецпасланнік Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі на інаўгурацыі Прэзідэнта Беларусі:

— Напярэдадні адбыліся нашы перамовы з Прэзідэнтам Беларусі, падчас якіх быў абмеркаваны ўвесь спектр беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Сёння беларуска-кітайскія адносіны выйшлі на якасна новы ўзровень. Хачу адзначыць беспрэцэдэнтна высокую ступень двухбаковага ўзаемадзеяння, якое сведчыць аб узаемнай зацікаўленасці ў далейшым развіцці сувязяў паміж КНР і Рэспублікай Беларусь. На мой погляд, перспектывы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва вельмі вялікія.

Кітай уважліва назірае за развіццём свайго стратэгічнага партнёра — Беларусі. Нашы краіны — добрыя даўнія сябры. І мы рашуча падтрымліваем абраны Беларуссю шлях, які дазваляе забяспечваць стабільнасць, бяспеку і мірнае развіццё.

Фота БЕЛТА.

Святлана САРОКА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:

— Зноў абраны Прэзідэнт нашай краіны нагадаў усім прысутным удзельнікам інаўгурацыі аб здабытках і складанасцях дваццаці мінулых гадоў яго кіравання. Пра тое, што мы, беларускі народ, пераадолелі цяжкасці і рушым наперад. Але пры гэтым Аляксандр Лукашэнка засяродзіў сваю ўвагу найперш на сучаснасці. На неабходнасці мадэрнізацыі вытворчасці, развіцці адукацыі і сацыяльнага забеспячэння кожнага, асабліва маладых сямей, матуль, старых. Падкрэсліў тое, як шмат пабудавана новых аб'ектаў — і культурных, і спартыўных. Створаны ўсе ўмовы для таго, каб людзі дастойна жылі, вялі здаровы лад жыцця, расцілі дзяцей і духоўна ўзбагачаліся.

Прэзідэнт падзяліўся планамі на найбліжэйшыя пяць гадоў, на якія народ даверыў яму кіраваць дзяржавай, і адразу адзначыў, што гэта будзе вельмі складаны для ўсіх час. Але «калі народ адзіны, ён непераможны». Сапраўды, у нацыянальным адзінстве закладзена невычэрпная сіла, з дапамогай якой мы разам будзем ладзіць сваю будучыню, падтрымліваць міралюбівую палітыку. Таму ў беларускага народа павінен быць вельмі моцны духоўны стрыжань: ён дапаможа нам пераадолець перашкоды, што сустрэнуцца на шляху стварэння мірнай, спакойнай і квітнеючай краіны.

Таццяна УДАВЕНКА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:

— Я сапраўды адчула адзінства Прэзідэнта з народам. Мы абралі шлях развіцця і зладжана будзем яго прытрымлівацца як у эканоміцы, так і ў знешняй і ўнутранай палітыцы. Гэта мяне супакойвае і выклікае гонар за Беларусь. Нашу краіну паважаюць. Якія санкцыі ў эканоміцы і да асобных грамадзян ні выкарыстоўваліся б, мы на правільным шляху і працягваем развівацца.

ISSN 1990 - 763X

Фота БЕЛТА.

ГОДНА АБАРАНЯЦЬ РАДЗІМУ

Пасля заканчэння цырымоніі ў Палацы Незалежнасці на плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь беларускія ваеннаслужачыя прынеслі клятву на вернасць народу і Прэзідэнту.

У цырымоніі прынялі ўдзел прадстаўнікі Узброеных Сіл, унутраных войскаў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, Службы бяспекі Прэзідэнта, супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Яны запэўнілі беларускі народ і Галоўнакамандуючага ў тым, што заўсёды гатовы надзейна абараняць суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць сваёй Радзімы.

Ваеннаслужачыя ўрачыста пакляліся з годнасцю і гонарам несці высокае званне абаронцаў Айчыны, самаддана служыць беларускаму народу і Прэзідэнту, абараняць Радзіму мужна, умела, не шкадуючы сваіх сіл і самога жыцця.

Фота БЕЛТА.

Як Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі заявіў, што ставіць сабе за найвышэйшую мэту надзейную абарону інтарэсаў краіны, яе канстытуцыйных асноў і тэрытарыяльнай цэласнасці.

«Узначаліць дзяржаву — вялікая адказнасць перад сваім народам і Айчынай», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што «ўступленне Прэзідэнта на пасаду — гэта заўсёды новы этап у жыцці краіны і чарговы гістарычны адрэзак часу, з якім грамадства звязвае свае надзеі на будучыню».

«Свет вакол нас не стаў больш паспяховым. І гэта аказвае свой негатыўны ўплыў на Беларусь. Але мы абавязкова захаваем нашу дзяржаву. Мы даражым нашай Радзімай. Будзем адзіныя, паслядоўныя і настойлівыя ў стваральнай працы, прынцыповыя і рашучыя ў адстойванні нацыянальных інтарэсаў», — заклікаў Прэзідэнт.

Беларусь, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, ніколі нікому не пагражала і пагражаць не будзе: «Наша ваенная мэта — абараніць свой кавалак зямлі, на якім спрадвеку жыла частка славянскага народа, беларусы, чыстая, прыгожая і адукаваная нацыя».

«Мы нікому не аддадзім ні кавалка нашай зямлі, не пагражаючы нашым суседзям і іншым дзяржавам. Нам не трэба чужога, але і свайго не аддадзім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Людзі ў пагонах, паводле яго слоў, павінны абараняць сваю зямлю, сем'і, родных. «Мы жыццём сваім павінны абараніць нашу краіну, у якой будзе жыць мірная і паспяховая нацыя», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што Беларусь будзе і ў далейшым у поўнай меры выконваць узятыя на сябе па міжнародных дагаворах і пагадненнях абавязацельствы па захаванні міру. «Бяспечная будучыня Беларусі залежыць толькі ад нас з вамі і ні ад каго іншага. Для паспяховага развіцця краіны ў нас ёсць абсалютна ўсё неабходнае: шматвяковая нацыянальная культура, духоўныя каштоўнасці, эканамічны і навуковы патэнцыял. А галоўнае — добрыя і дастойныя людзі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Разам мы ўжо зрабілі вельмі шмат на складаным шляху дзяржаўнага станаўлення і развіцця. У стваральнай працы нас аб'ядноўвалі любоў да Радзімы, упэўненасць у сваіх сілах і імкненне да агульнага дабрабыту. Усе гэтыя гады нацыянальная сістэма забеспячэння бяспекі была гарантам аховы мірнай працы беларускага народа ад любых пагроз», — канстатаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Сёння Беларусь — паўнапраўны, аўтарытэтны член сусветнай супольнасці, гатовы абараніць ад замахаў свой суверэнітэт. Гэта краіна высокіх сацыяльных стандартаў, у якой забяспечаны стабільнасць і грамадзянская згода».

Ён звярнуў увагу, што на плошчы Дзяржаўнага сцяга ў адзіным страі стаяць прадстаўнікі ўсіх сілавых структур дзяржавы, здольныя забяспечыць мірныя ўмовы для стваральнай працы. «Пад вашай надзейнай абаронай, нашай абаронай, усе разам мы пераадолеем любыя цяжкасці і вырашым самыя маштабныя задачы на карысць нашага агульнага дома — Рэспублікі Беларусь!» — выказаў упэўненасць Прэзідэнт.

НАМ ЁСЦЬ ШТО АДСТОЙВАЦЬ І ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Такія пераўтварэнні правялі ўжо ў суседніх Расіі, Украіне. Ён заклікаў вучыцца на чужых памылках. «Яны паспрабавалі, паспыталі гэтых рэформаў — і што? — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка. — Што дрэннага ў той сістэме, якую мы стварылі?» Прэзідэнт нагадаў аб поспехах, якія былі дасягнуты ў сацыяльнай сферы, у тым ліку ў ахове здароўя, адукацыі.

Кіраўнік дзяржавы таксама выступіў супраць таго, каб увесці прыватную ўласнасць на зямлю і раздаць яе фермерам. Прэзідэнт падкрэсліў, што гэты крок немэтазгодны, паколькі сельская гаспадарка (і аб гэтым сведчыць вопыт еўрапейскіх краін) мае патрэбу ў падтрымцы дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не мае намеру займацца дзяльбой і разбазарваннем таго, што стагоддзямі накоплена беларускім народам. «Гэта заўсёды ў славянскіх народаў заканчваецца трагедыяй: калі не рэвалюцыяй, то грамадзянскай вайной, а часта, як было ў гісторыі, і тым, і другім», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што раней беларускі бок прапаноўваў купіць акцыі «Беларуськалія», які ацэньваецца ў $32 млрд. Прэзідэнт дадаў, што спецыялісты прызнаюць гэтую цану. «У нас хто-небудзь купіў хоць адну акцыю за гэты кошт? Не», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама даў зразумець, што катэгарычна не згодны з такой прыватызацыяй прадпрыемстваў, пры якой заніжаецца іх цана.

ПРЫЯРЫТЭТЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ ДЛЯ НАРОДА

«У спакойнай і бяспечнай краіне нам трэба будзе вырашыць маштабныя задачы ў эканоміцы. Трэба ўзняць яе на больш высокі ўзровень. Эканоміка наступнай пяцігодкі — якасна іншая эканоміка. Мы прадоўжым тэхналагічную, кіраўніцкую і інавацыйную мадэрнізацыю», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Эканомія, якасць і эфектыўнае кіраванне павінны стаць галоўным прыярытэтам. Пры гэтым патрабаванне безумоўнага захавання рабочых месцаў і выплаты дастойных зарплат застаецца ў сіле», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Перад намі мэта — не на словах, а на справе пабудаваць інавацыйную эканоміку, эканоміку ведаў. У перспектыве наша краіна павінна ўвайсці ў лік найбольш развітых дзяржаў», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

«Мы зробім усё, што ад нас залежыць, каб Беларусь стала адным з самых прыцягальных месцаў для інвестыцый, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Абапіраючыся на супрацоўніцтва з дзелавымі коламі вядучых краін, кааперацыйныя сувязі з нашымі традыцыйнымі партнёрамі, мы маем намер і далей нарошчваць свой экспарт. Пры гэтым актывізуем работу па пошуку новых рынкаў збыту». Прэзідэнт звярнуў увагу, што за апошнія гады ў гэтым напрамку краіна набыла сур'ёзны вопыт.

«Высокаразвітая эканоміка стане гарантам незалежнасці Беларусі», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

НА СКРЫЖАВАННІ ЎСІХ ДАРОГ

«Некаторыя, пачуўшы або ўбачыўшы, што мы вядзём перагаворы з прадстаўнікамі Злучаных Штатаў Амерыкі або Еўрасаюза, пачынаюць крычаць аж да Уладзівастока: Лукашэнка кудысьці разварочваецца! Як толькі ўбачылі нашы брацкія, цёплыя тэндэнцыі адносна нашай Расіі, нашай роднай Украіны, іншых постсавецкіх рэспублік — ужо на дыбкі становяцца на Захадзе», — адзначыў Прэзідэнт.

«Ды не разрывайце вы нас! Дайце нам спакойна жыць на гэтым кавалачку зямлі! Мы забяспечым вашы інтарэсы, і Усходу, і Захаду, у Беларусі. Усё, што вы хочаце, мы зробім. Толькі не разрывайце нас, не сутыкайце нас з Расіяй, не сутыкайце нас у Расіі, на Усходзе з Захадам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы нікуды не паварочваем! Мы хочам жыць на сваёй зямлі. Мы хочам, каб жыццёва важныя інтарэсы беларусаў былі тут, на гэтым кавалачку зямлі. Мы ні на што, заўважце, больш не прэтэндуем. У нас няма жыццёва важных інтарэсаў нават у суседніх дзяржавах. Мы хочам спакойнага і мірнага жыцця», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што калі беларускаму боку намякаюць з Захаду, каб трымаліся далей ад Расіі, ён заўсёды сумленна і шчыра гаворыць, што Беларусь не можа быць далей ад Расіі, ад Украіны і Казахстана, таму што «мы выраслі з аднаго кораня». «Як гэта можна разарваць? Так, у нас ёсць уласны пункт гледжання, так, у нас ёсць уласныя інтарэсы, і мы не раз гэта дэманстравалі», — сказаў беларускі лідар.

Фота БЕЛТА.

«Але калі нас будуць на Усходзе падбухторваць супраць Захаду і нехта будзе радавацца санкцыям, якія Захад супраць нас уводзіць, не дачакаецеся! — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы будзем нармалізоўваць адносіны з Захадам, таму што яны таксама нашы суседзі. У нас ёсць там эканамічныя інтарэсы. У нас сёння 42 працэнты экспарту ў Расію, а больш як 50 працэнтаў — у Еўрасаюз. Дык як мы можам ад гэтага адмовіцца? І навошта ў гэты складаны і цяжкі час нас спрабаваць спіхнуць з гэтай дарогі, з гэтага шляху шматвектарнай знешняй палітыкі? Навошта? Калі тут застаўся адзіны, 800 км па шырыні калідор, дзе і Усход, і Захад могуць спакойна перамяшчацца і супрацоўнічаць?»

«Гэта мой адказ тым, хто спрабуе з нас зрабіць ворагаў для Расіі і для Захаду», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Прадвызначыў Бог так, што мы знаходзімся ў гэтым месцы, у цэнтры Еўропы, на скрыжаванні ўсіх дарог. І гэта дарога стала сёння не заўсёды стабільнай, а часта гарачай. І мы павінны быць мудрымі палітыкамі, каб, жывучы ў гэтым бурным катле, не згарэць, каб нас не зварылі і не з'елі, па-народнаму кажучы», — адзначыў ён.

«Таму мы будзем праводзіць міралюбівую знешнюю палітыку, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І мы будзем выходзіць з уласных інтарэсаў і інтарэсаў нашых суседзяў».

СТРАТЭГІЯ ШМАТВЕКТАРНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

«Мы прадоўжым стварэнне Саюзнай дзяржавы з брацкай Расіяй, калі яна гэтага пажадае. Будзем развіваць цеснае ўзаемадзеянне з партнёрамі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, пры гэтым непахісна адстойваючы ўласныя інтарэсы», — сказаў Прэзідэнт. Беларускі лідар падкрэсліў, што Беларусь будзе і ў далейшым актыўным ігракам на постсавецкай прасторы. «Гэта не толькі залог нашага дабрабыту, але і абарона ад розных пагроз», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што імклівa развіваюцца адносіны Беларусі са стратэгічным партнёрам — вялікім Кітаем. Аляксандр Лукашэнка выказаў словы ўдзячнасці старшыні КНР Сі Цзіньпіну і дэлегацыі, якую той накіраваў у Мінск на цырымонію інаўгурацыі. «Мы з імі правялі тры дні ў рабоце, шмат спрачаліся, вялі перагаворы. І я прашу перадаць Сі Цзіньпіну самыя добрыя пажаданні за яго падтрымку беларускага народа ад імя гэтага народа», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Фота БЕЛТА.

Ён дадаў, што Беларусь развівае сувязі з дзяржавамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, і ў гэтым ужо ёсць пэўныя вынікі.

«Наша краіна адкрыта для раўнапраўнага супрацоўніцтва і дружбы з краінамі Захаду, ЗША і Еўрасаюзам, калі яны гэтага хочуць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Няма ніякіх перашкод для таго, каб перагарнуць старонкі мінулага і пачаць новую гісторыю адносін з чыстага ліста. Мы гатовы да гэтага і разлічваем на такую ж гатоўнасць нашых заходніх партнёраў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем заўважыў, што апошнім часам намеціліся добрыя перспектывы.

На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, адзінства і мэтанакіраванасць беларускага народа, яго адкрытасць і дружалюбнасць, яснасць праводзімага кіраўніцтвам краіны курсу прымусілі Захад паглядзець на Беларусь пад іншым вуглом. «Ён убачыў у нашай асобе прыстойнага партнёра, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы вітаем рух у гэтым напрамку».

«Мы заўсёды сцвярджалі: спробы ізаляваць Беларусь, як і іншыя краіны, — гэта тупіковы шлях. Ён прыводзіць да сітуацыі, калі прайграюць усе», — сказаў беларускі лідар. «Лёгка стаць на шлях санкцый, але вельмі складана потым звярнуць з яго і вярнуцца да нармальнага жыцця. Таму не трэба заганяць сябе ў кут», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

КАЛІ НАРОД АДЗІНЫ, ЁН НЕПЕРАМОЖНЫ

Прэзідэнт адзначыў, што ўсе разам мы стварылі жыццяздольную дзяржаву, якая стабільна развіваецца, пабудавалі нямала жылля, школ, бальніц, цудоўных палацаў культуры, спартыўных арэн, сучасных дарог і іншых аб'ектаў інфраструктуры, мадэрнізавалі тысячы прадпрыемстваў прамысловасці, што, выказаў упэўненасць Прэзідэнт, ужо ў бягучай пяцігодцы дасць эфект. У сціслыя тэрміны была вырашана праблема харчовай бяспекі. Больш за тое, прадукцыя беларускага АПК ператварылася ў сур'ёзную крыніцу экспарту.

«Створаны патэнцыял дасць магчымасць нам нават у перыяд глабальных эканамічных узрушэнняў забяспечваць развіццё Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У краіне пануе мір і сацыяльная справядлівасць. Чалавеку адкрыты ўсе шляхі: спрыяльныя ўмовы для работы, адукацыі, раскрыцця талентаў, выхавання сапраўдных майстроў сваёй справы. Гэта наша з вамі найвялікшая заслуга. Колькі мы патрацілі крыві і поту, каб гэтую сістэму стварыць...»

«Усё гэта фарміруе ў людзей пачуццё абароненасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Няхай гэтая ўпэўненасць будзе і ў тых, хто не галасаваў за сённяшні курс. Іншы пункт гледжання, калі ён прадыктаваны шчырым клопатам аб Радзіме, заўсёды будзе пачуты. А ўсе разумныя ідэі — выкарыстаны і ажыццёўлены», — гарантаваў кіраўнік дзяржавы.

«Кожны чалавек у Беларусі знаходзіцца пад аховай закону, а значыць, і Прэзідэнта», — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка. «Гэты прынцып непахісны. Толькі такім чынам можна дабіцца кансалідацыі грамадства, абудзіць у ім стваральную энергію. Гэтых падыходаў мы будзем прытрымлівацца і ў будучыні», — сказаў ён.

Прэзідэнт заклікаў беларускі народ быць непадзельным цэлым і захоўваць згоду ў грамадстве. «Яшчэ здаўна гаварылі: калі народ адзіны, ён непераможны. Увесь наш гістарычны шлях, вопыт абавязваюць як зрэнку вока берагчы згоду ў грамадстве. Мы павінны быць непадзельным цэлым, тым маналітным арганізмам, які называецца «беларускі народ», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў: «Мы ўсе павінны разумець галоўнае, выразна яго ўсведамляць: наша будучыня ў першую чаргу ў нашых руках. Вырашэнне ўласных праблем ляжыць найперш унутры, а не звонку краіны».

Паводле слоў Прэзідэнта, толькі ўпартая праца, разважлівасць і мудрасць будуць садзейнічаць развіццю Беларусі. «Вы, беларусы, на мяне не крыўдуйце, але, калі вы будзеце, скажу па-народнаму, дзесьці ленавацца, я вас вельмі сур'ёзна буду падштурхоўваць. Не бывае так, што вінавата толькі ўлада, а ўсе астатнія добрыя. Перш чым кагосьці ацаніць або пакрытыкаваць, паглядзіце на сябе, ці ўсё вы зрабілі для таго, каб вы, ваша сям'я, вашы родныя, блізкія, знаёмыя і наогул дзяржава былі шчаслівыя і жылі добра. Напэўна, не ўсё. Давайце гэтую «рэформу» пачнём з сябе. І калі мы з сябе пачнём, то мы спынім усялякія размовы пра рэформы. Мы проста будзем жыць выдатна, і нам не трэба будзе ставіць перад сабой якія-небудзь рэфарматарскія мэты на злом існуючага палітычнага і эканамічнага ладу», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што цяпер адкрываецца новая старонка ў гісторыі Беларусі. «Яна будзе вельмі змястоўнай, цікавай і неймаверна цяжкай. Каб паспяхова рухацца наперад, нам трэба будзе задзейнічаць усе свае рэзервы, праявіць вытрымку, самаадданасць, рашучасць, талент. Словам, паказаць свае найлепшыя якасці — той унутраны духоўны стрыжань, дзякуючы якому наш народ выходзіў пераможцам з любых сітуацый, таму што верыў у свае сілы і збіраў іх у кулак», — сказаў беларускі лідар.

«Мы ўсе хочам добра жыць, гэта нармальнае жаданне, патрабаванне народа да ўлады. Больш за тое, усе мы хочам жыць вельмі добра. Але пры гэтым яшчэ раз падкрэсліваю: усё залежыць ад нас. Будзем лепш працаваць — будзем лепш жыць. Простая формула, якую ніхто не змог абвергнуць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Я строгі чалавек, я буду патрабаваць ад народа, ад сваіх падначаленых максімальна. Інакш у гэтым разладзе не вытрымаем — разарвуць на кавалкі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Я ўсведамляю, што некаторыя людзі прагаласавалі за мяне авансам. Гэта зразумела, асабліва на прэзідэнцкіх выбарах. Можа, хтосьці сумняваецца, ці таго выбралі». Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: «Вы прагаласавалі правільна, і не таму, што я выключны, не таму, што я самы разумны і больш такіх няма, а таму, што мы сёння нікому нічога не павінны. Мы не адмывалі грошы ў перадвыбарную кампанію. Мы абышліся капейкамі, праводзячы выбары. Я нікому не даваў ніякіх абяцанняў — ні на Усходзе, ні на Захадзе, ні ў Амерыцы, ні ў Афрыцы. Мы прайшлі гэтыя выбары незалежна. Гэта самы вялікі здабытак, калі Прэзідэнт перамагае дзякуючы народу, калі яго народ выбірае, калі не адыгрываюць ролі грошы, калі мільярды не ўкідваюць у перадвыбарную кампанію, адмываючы і раскладаючы іх па кішэнях».

Звяртаючыся да выбаршчыкаў, у першую чаргу да моладзі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі вы пойдзеце ў далейшым галасаваць за кіраўніка дзяржавы, паглядзіце, якія грошы і якія людзі за ім стаяць. У мяне няма чужых людзей і няма грошай. У мяне ёсць толькі вы, ёсць беларускі народ. І яму я гатовы служыць да апошніх дзён, колькі ён будзе мне даваць».

«Я звычайны чалавек. І значыць, магу памыляцца. Але я заўсёды стаўлю перад сабой жалезную задачу — не дапусціць пры такой уладзе сістэмных памылак. І мы з вамі іх не дапусцілі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Былі розныя перыяды. Можа, мы недзе няправільна рабілі. Пройдзе час — гісторыя ацэніць, народ ацэніць».

Звяртаючыся да сваіх прыхільнікаў, Прэзідэнт заявіў: «Я ніколі вам не здраджу. Я — чалавек, не здольны на здраду. Лічу, што лепш няхай цябе заб'юць на полі бітвы, але ты не павінен адступіць, ты не павінен здрадзіць свайму народу, сваім ідэям, усяму таму, што ты абяцаў. Хачу з гэтай высокай трыбуны заявіць: гэтага не было тыя 20 гадоў, што я служу народу, нашай дзяржаве. І гэтага не будзе ніколі».

Паводле БЕЛТА.

РАЗАМ — У НОВЫ ДЗЕНЬ

Учора з нагоды ўступлення на пасаду Прэзідэнта ў Палацы Рэспублікі адбыўся святочны канцэрт «Разам у новы дзень». На галоўнай сцэне краіны выступілі дарослыя і дзеці, таленавітыя самародкі з глыбінкі і вядомыя беларускія артысты, а таксама славутыя землякі, якія жывуць у розных краінах свету, але аб'яднаны любоўю да сваёй роднай Беларусі.

На святочным мерапрыемстве прысутнічаў і кіраўнік дзяржавы. Выступаючы перад прысутнымі, ён сказаў: «Няма той залы, у якую мы маглі б запрасіць усіх тых, хто душой і сэрцам, працай дакрануўся да гэтай вельмі важнай палітычнай кампаніі». «Вы яшчэ проста не зразумелі, што вы здзейснілі, як вы зрабілі гэты дзень і будучыню нашай краіны», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што быў добра інфармаваны аб ходзе выбарчай кампаніі, хоць і не мог умешвацца ў яе ход. «Я папярэдзіў кіраўнікоў майго штаба, Адміністрацыі Прэзідэнта, губернатараў, іншых, хто меў дачыненне да кампаніі, сказаўшы аб тым, што выбары для мяне закончыліся напярэдадні іх. Выбары гэтыя будуць вашы, вы іх павінны правесці, каб ніхто не паказаў пальцам у наш бок, што ў нас дыктатура і нікому не даюць рот адкрыць. Я вельмі пільна назіраў за работай у рэгіёнах — ад вёсак да сталіцы. Дзе б я ні знаходзіўся, я быў інфармаваны, як ідзе работа ў перадвыбарных штабах», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў важнасць таго, што выбарчая кампанія прайшла ціха і спакойна. «Тое, што народ прыйшоў ціха і паказаў, хто ў доме гаспадар, не значыць, што не было той вялікай работы, каласальнай працы па арганізацыі перадвыбарнай кампаніі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён яшчэ раз выказаў словы ўдзячнасці ў адрас выбаршчыкаў, якія падтрымалі яго на выбарах: «Я, напэўна, не знайду тых слоў, каб падзякаваць усім вам так, каб вы адчулі, як я ўдзячны вам за тое, што мы зрабілі. І не толькі таму, што вы садзейнічалі выбранню мяне Прэзідэнтам, не ў гэтым справа. Галоўнае, што вы прымусілі ўвесь свет прызнаць сумленнасць выбараў і прымусілі ўвесь свет гаварыць пра Беларусь».

Фота БЕЛТА.

■ На слыху

НАЯЎНАСЦЬ МАНЕТЫ ВЫКЛІКАЕ ДА ГРОШАЙ БОЛЬШЫ ДАВЕР

Сёння эканамічнымі агентамі найбольш пазітыўна ўспрымаецца тая грашовая адзінка, дзе прысутнічае найменшая колькасць нулёў

Кіраўнік дзяржавы 4 лістапада падпісаў Указ №450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь». Такім чынам, замест банкнот узору 2000 года (што мы маем сёння) налета ў ліпені ў абарачэнне ўвойдуць грашовыя знакі ўзору 2009 года ў выглядзе банкнот і манет у суадносінах 10 тысяч «старых» рублёў да 1 беларускага рубля новага ўзору. Замену банкнот плануюць ажыццявіць з 1 ліпеня па 31 снежня 2016 года. Нягледзячы на тое, што дэнамінацыя пачнецца толькі налета, ужо цяпер прадстаўнікі Нацбанка вырашылі раскрыць асобныя нюансы будучага абмену.

Што гэта і дзеля чаго?

— Па сутнасці, сама дэнамінацыя грашовых сродкаў ніякім чынам не паўплывае на рэальны кошт тавараў у крамах або нейкіх паслуг. Гэта выключна тэхнічнае дзеянне, якое прадугледжвае ўзбуйненне беларускага рубля ў маштабе 1 да 10 тысяч, — паведаміў **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Дзмітрый ЛАПКО.**

Не зменяцца пасля дэнамінацыі і рэальныя памеры заробкаў, стыпендый, пенсій, дапамог, рэшткі грашовых сродкаў на банкаўскіх рахунках, а таксама балансы прадпрыемстваў і ўстаноў. Пры такой «ракіроўцы» адбываецца змена выключна фармату грашовых сродкаў, пасля якой грошы «губляюць» чатыры нулі. Пакупніцкая здольнасць нашага рубля ад гэтага не мяняецца.

Акрамя таго, адзначыў Дзмітрый Лапко, «палітыка Нацыянальнага банка на 2016 год ужо сёння фарміруе ўзровень унутранай і знешняй збалансаванасці, які неабходны для пачатку правядзення дэнамінацыі». Паводле слоў спецыяліста, гэта звязана са збалансаванасцю знешнегандлёвага сальда і жорсткай скіраванасцю манетарнай палітыкі на зніжэнне інфляцыі. Станоўчы эфект на плацежны баланс ад рэалізацыі названых мер з кожным месяцам павялічваецца. Сёлета на працягу 9 месяцаў дынаміка змены спажывецкіх цэн дэманстравала ўстойлівую тэндэнцыю да зніжэння. Так, са студзеня па верасень у гадавым выражэнні прырост коштаў знізіўся з 17,1% да 11,9%. У выніку павышаецца абарона пакупніцкай здольнасці беларускага рубля.

Тут спецыялісты Нацбанка разлічваюць, што пры захаванні існуючых падыходаў у эканамічнай палітыцы ўдасца давесці гадавы ўзровень інфляцыі да 2020-га да 5%. А правядзенне налета дэнамінацыі павінна стаць дадатковым фактарам зніжэння чакання інфляцыі з боку ўсіх суб'ектаў гаспадарання і павелічэння даверу да нацыянальнай валюты. Запланаванае правядзенне дэнамінацыі прадугледжвае паэтапную (на працягу 6 месяцаў) замену банкнот аднаго ўзору на новыя грашовыя знакі. Пры гэтым прадугледжаны паралельны абарот банкнот двух узораў у гандлі, аб'ектах сэрвісу і банках. Асобна Дзітрый Лапко адзначыў, што эканамічнымі агентамі найбольш пазітыўна ўспрымаецца тая грашовая адзінка, дзе прысутнічае найменшая колькасць нулёў. Таму дэнамінацыя і праводзіцца 1 на 10 тысяч. Гэта значыць, што найменшаму наміналу сённяшняй банкноты — 100 рублёў — будзе адпавядаць новы намінал — 1 капейка. Прапануемы маштаб узбуйнення прадугледжвае ўвядзенне ў абарачэнне разменнай цыркуляцыйнай манеты.

Колькасць папяровых грошай паменшыцца ў разы

Да 1 ліпеня 2016-га ў абароце будзе знаходзіцца каля 600 млн грашовых знакаў узору 2000 года. Для іх замены патрабуецца ўсяго 80 млн банкнот новага намінальнага ўзору і 400 млн манет. Гэта азначае, што значна скароцяцца выдаткі на транспарціроўку, пералік, захоўванне, дастаўку грошай да спажыўца. «Увядзенне манеты — добра гэта ці дрэнна? Тэрмін службы манеты складае ад 10 да 15 гадоў, а тэрмін службы разменнай банкноты дробнага наміналу — ад 6 да 12 месяцаў, і гэта ў найлепшым выпадку», — адзначыў Дзмітрый Лапко.

Так, у сувязі з дэнамінацыяй у прадпрыемстваў узнікнуць дадатковыя выдаткі. Аднак спецыялісты лічаць, што яны акупяцца даволі хутка. Пры апрацоўцы грашовай наяўнасці прадпрыемствы выкарыстоўваюць ручную працу. «Калі ў Нацыянальным банку ёсць сартавальная тэхніка, якая можа сама лічыць грашовыя купюры, то прадпрыемствы, крамы, невялікія банкі такой тэхнікай не валодаюць.

У 6 месяцаў паралельнага абарачэння розных банкнот нават здачу могуць выдаваць і новымі, і старымі грашыма.

Колькі каштуе замена старых грошай на новыя, у галоўным банку краіны агучваць не сталі. Галоўныя выдаткі ўжо панесены ў 2008-2009 гадах, калі грошы былі выраблены. Тут застаецца пытанне толькі аб перапраграмаванні абсталявання, забеспячэнні манетапрыёмнікамі тых прылад, якія імі не валодаюць. Па ацэнцы Нацбанка, гэта невысокія выдаткі ў параўнанні з той эканоміяй, якая будзе атрымана пры замене існуючых сёння банкнот.

Да 1 ліпеня новых грошай на руках не будзе

Спецыяліст Нацбанка акцэнтаваў увагу на тым, што да 1 ліпеня ніхто і нідзе не можа і не павінен абменьваць нашы грошы. Новыя купюры з'явяцца ў абароце як законны плацежны сродак толькі налета пасля 1 ліпеня. «А вось калі нехта паспрабуе да ліпеня прапаноўваць ажыццявіць абмен старых грашовых знакаў на знакі новага ўзору — гэта махляр», — адзначыў Дзмітрый Лапко.

Ён паведаміў, што дзяржаўныя органы будуць працаваць скаардынавана, Савет Міністраў і Нацыянальны банк распрацуюць план мерапрыемстваў па правядзенні дэнамінацыі. Плануецца размяшчэнне плакатаў, якія будуць адлюстроўваць новыя грошы, а таксама арганізацыя пэўных інфармацыйныйных лекцый. Ужо цяпер з боку праваахоўных органаў будзе забяспечвацца кантроль за магчымымі падобнымі дзеяннямі.

Шэсць бачных ступеняў абароны

Гэтыя бачныя асаблівасці новых купюр можа адрозніць любы дарослы чалавек. Увогуле Нацбанк надае вялікую ўвагу пытанням бяспекі і абароненасці грошай, руху да распазнавання банкнот, зручнасці для карыстальнікаў. Акрамя таго, у банкнот ёсць яшчэ маса нябачных ступеняў абароны, якія раскрываюцца толькі банкам, а асобныя ведае толькі Нацыянальны банк.

Варта адзначыць, што падрыхтоўка да правядзення дэнамінацыі заняла досыць працяглы перыяд. Так, новыя грашовыя знакі, якія будуць уведзены ў абарот з 1 ліпеня, былі выраблены па заказе Нацбанка яшчэ ў 2008 годзе. Аднак тады, у сувязі з сусветным эканамічным крызісам і, як следства, пагаршэннем эканамічнай сітуацыі ў нашай краіне, правядзенне дэнамінацыі было адкладзена, а выраблены грашовыя знакі перададзены ў Цэнтральнае сховішча Нацыянальнага банка.

З улікам часу вырабу новыя беларускія рублі маюць пэўныя асаблівасці. У прыватнасці, на банкнотах узору 2009 года размешчана факсіміле подпісу Пятра Пракаповіча, які займаў на той момант пасаду старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі. Акрамя таго, на новай банкноце наміналам 50 рублёў размешчаны надпіс «пяцьдзесят», які не адпавядае дзейным цяпер правілам беларускай арфаграфіі. Сёння гэтае слова павінна пісацца праз літару «я» ў другім складзе — «пяцьдзясят». Пры ажыццяўленні Нацыянальным банкам наступных заказаў на выраб новых банкнот названыя неадпаведнасці будуць ліквідаваны.

500 рублёў масава штампаваць не будуць

У сувязі з увядзеннем новых грошай узнікае пытанне аб магчымай актывізацыі фальшывамanетчыкаў. Аднак, гэтая праблема ў нашай краіне востра не стаіць, як лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення наяўнага грашовага абароту Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей ГАЙКО.** «Нязначную колькасць купюр мы разам з банкаўскай сістэмай выяўляем, канфіскоўваем, такая праца праводзіцца ў звычайным штатным рэжыме», — адзначыў спецыяліст.

Паводле яго слоў, пры распрацоўцы і вытворчасці новых грашовых наміналаў выкарыстоўваліся найноўшыя тэхналогіі. «Новая банкнота не валодае вялікай колькасцю ахоўных элементаў, але яна больш абаронена, таму што яна новая, яна іншая банкнота», — сказаў Сяргей Гайко.

Увогуле, у абарот будуць уведзены 7 наміналаў банкнот і 8 наміналаў манет. Сяргей Гайко дадаў, што новыя банкноты рознага колеру і будуць адрознівацца ад існуючых сёння грошай па памеры. У сваю чаргу Дзмітрый Лапко падкрэсліў, што рэгулятар на першапачатковым этапе банкноты буйных наміналаў будзе выпускаць у абарачэнне не масава.

Беларускія грошы з еўрапейскай «прапіскай»

Арганізацыю па вырабе банкнот і манет Нацбанк выбіраў па конкурсе, у якім удзельнічалі вядучыя сусветныя вытворцы. Пераможцаў конкурсу Нацбанк, праўда, не агучыў. «Магу вас запэўніць, што гэта еўрапейскі вытворца з прасунутымі і сучаснымі тэхналогіямі», — сказаў Дзмітрый Лапко.

Як заўважылі спецыялісты, сабекошт вырабу адной купюры і манеты вагаецца ад 1 да 4 еўрацэнтаў. Але ўласнага манетнага двара ў Беларусі пакуль не будзе. Каб арганізаваць такую вытворчасць, неабходна выдаткаваць каласальныя сродкі для абсталявання прадпрыемства, якое магло б адпавядаць міжнародным правілам, а таксама валодаць адпаведнымі тэхналогіямі.

Не ўсе банкаматы і ў ліпені будуць выдаваць новыя грошы

Нягледзячы на тое, што да старту дэнамінацыі застаецца яшчэ каля 8 месяцаў, прадстаўнікі Нацбанка ўпэўнены, што далёка не ўсё банкаўскае абсталяванне будзе імгненна пераведзена на новы фармат грошай. На працягу акрэсленага паўгода пасля пачатку дэнамінацыі асобныя банкаматы будуць выдаваць і старыя грошы. Згодна з указам аб дэнамінацыі, з 1 ліпеня на тэрыторыі краіны цэны павінны паказвацца паралельна ў двух фарматах — у старых і новых банкнотах. Гэта зроблена спецыяльна для таго, каб у гандлёвых арганізацый не было спакусы акругліць цану ў большы бок.

«Увогуле, у гэтыя 6 месяцаў паралельнага абарачэння розных банкнот, калі новыя купюры і манеты ўжо ўвядуць у абарот, — адзначыў Дзмітрый Лапко, — нават здачу могуць выдаваць і новымі, і старымі грашыма». Тое ж самае тычыцца і банкаматаў. «Але мы будзем прыкладаць усе намаганні, каб хутчэй вывесці з абароту старыя банкноты», — дадаў ён.

Стаўкі па крэдытах налета знізяцца

Адказваючы на пытанне журналістаў, Дзмітрый Лапко паведаміў, што працэнтныя стаўкі па крэдытах для насельніцтва ў 2016 годзе знізяцца, але гэта ніяк не звязана з дэнамінацыяй.

«Крэдыты будуць таннець, таму што ў адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі на наступны год мы плануем, што ўзровень інфляцыі не перавысіць 12% і ажыццяўленне прынятай грашова-крэдытнай палітыкі дазволіць істотным чынам паменшыць стаўкі ў рэальным сектары эканомікі і, адпаведна, стаўкі для насельніцтва», — адзначыў Дзмітрый Лапко.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

СВЯТА, ЯКОЕ ЗАЎСЁДЫ З НАМІ

XXII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» адкрыты

І разбіта талерка, і ўручаны спецыяльны прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве», і паказаны фільм адкрыцця «Даліна любові» з Ізабэль Юпер і Жэрарам Дэпардзье ў галоўных ролях... Першы дзень падарыў час і прастору для таго, каб плаўна ўвайсці ў патрэбны стан і ўспрыняць атмасферу фестывалю. А з сённяшняга дня мы патанаем у кіно, чым, зразумела ж, невымоўна задаволены.

Журналісты ўжо паспелі ўбачыць надзвычайную, пачуццёвую, бясконца прыгожую карціну «Неадчэпныя рытмы», фільм жанчыны пра жанчыну, які зняла госця фестывалю французская актрыса і рэжысёр Фані Ардан. Легенда французскага кінематографа здымалася ў Франсуа Труфо, Алена Рэнэ, Этарэ Скола, Франсуа Азона і іншых выбітных аўтараў. Карціна «Неадчэпныя рытмы» ўдзельнічае ў конкурсе «Маладосць на маршы», гэта другая рэжысёрская работа Ардан, і сёння ў кінатэатры «Масква» фільм прадставіць сама аўтарка.

Члены міжнародных журы выказалі свае чаканні ад праграм, якія ім давядзецца аналізаваць і ацэньваць, а некаторыя — глядзець для асабістага задавальнення. Дэвіз «Асалода для вачэй», што маркіруе кірунак сёлетняга падбору фільмаў, тут будзе дарэчы. «Не хачу забягаць наперад, але здаецца, праграма намячаецца цікавай, чаму нельга не радавацца», — кажа старшыня журы асноўнага конкурсу ігравога кіно Вадзім Абдрашытаў. «Я спадзяюся, што мы ўбачым тут новыя імёны» (член журы конкурсу «Маладосць на маршы» Таццяна Турсунава), «Я прыехаў як член журы, але не забываюся, што таксама дырэктар Варшаўскага міжнароднага кінафестывалю і хачу паглядзець беларускія і іншыя карціны, каб, магчыма, запрасіць у Польшчу» (член журы асноўнага конкурсу ігравога кіно Стэфан Лаўдзін), «Дзякуй фестывалю, які захаваў значнасць журы кінапрэсы, што прысуджае серабро Лістапада» (член журы кінапрэсы Людміла Перагудава), «Вельмі хацелася б, каб нацыянальная праграма склала дастойную канкурэнцыю іншым» (старшыня журы Нацыянальнага конкурсу Ігар Аўдзееў), «Фестываль дае шчаслівую магчымасць убачыць, пра што думаюць і як здымаюць аўтары, якія звяртаюцца да дзяцей і моладзі» (член журы конкурсу «Лістападзік» Міхаіл Тумеля), «Мне падабаецца дэвіз фестывалю «Асалода для вачэй», кіно — гэта асалода таксама для вушэй, а міжнародныя кінафестывалі часам арыентуюцца на фільмы, што не абяцаюць нічога добрага ні для вачэй, ні для вушэй. Мы будзем чакаць фільмаў, якія з'яўляюцца менавіта мастацтвам» (старшыня журы кінапрэсы Сяргей Трымбач).

Учора ў Цэнтральным кінатэатры быў паказаны іранскі фільм «Таксі» Джафара Панахі, уладальнік «Залатога мядзведзя» Берлінскага кінафестывалю. З сённяшняга дня стартуюць паказы конкурсных праграм, што размяркуюцца па кінатэатрах «Цэнтральны», «Масква», «Піянер», «Перамога» і «Мір». Самае якаснае кіно ў найбліжэйшыя дні сканцэнтруецца на гэтых экранах.

На цырымоніі адкрыцця «Лістапада» Спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» быў уручаны народнаму артысту Расіі Вадзіму Абдрашытаву.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. *katsyalovich@zviazda.by*

■ Зорны госць

БЯЖЫ, ВОЛЯ, БЯЖЫ!

Вольга Мазуронак штодня спускаецца з пятага паверха шматпавярховіка ў Каменнай Горцы, дзе жыве, і бяжыць да Драздоў. Так двойчы на дзень. Для кагосьці — гэта дзіва, а для яе бегаць — штодзённая праца, як для рабочага выточваць дэталі на заводзе. У перапынку першай трэніроўкі мы затрымалі Вольгу на 40 хвілін і распыталі аб захапленні бегам, спартыўнай хадой, пра нядаўні міжнародны мінскі паўмарафон, у якім наша гераіня стала пераможцай. З гэтага і пачалі.

Фота Надзеі БУЖАН.

«16 ТЫСЯЧ УДЗЕЛЬНІКАЎ — ЛІЧБА, ЯКАЯ ЎРАЖВАЕ»

— Ідэя арганізаваць у нашай сталіцы паўмарафон стала для вас нечаканасцю?

— Безумоўна. Яшчэ напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі са мной рабілі інтэрв'ю і спыталі, ці хацелася б мне, як лёгкаатлетцы, каб у Мінску правялі маштабныя спаборніцтвы па бегу? І я сказала, што, зразумела, хачу. Бо для нас гэта сапраўднае жыццё, свет, у якім мы жывём. Мяркую, што ўсе госці, якія прыехалі да нас на паўмарафон, ацанілі забег пазітыўна. Праўда, прызнаюся шчыра, я сумнявалася ў тым, што ўсё з першага разу можа так добра атрымацца. Пастаянна езджу па свеце, параўноўваю забегі, і магу сказаць: мінскі паўмарафон прайшоў годна.

— 16 тысяч удзельнікаў для паўмарафону — гэта…

— Лічба, якая ўражвае. А калі б у Мінску беглі марафонскую дыстанцыю, колькасць бегуноў была б яшчэ большай! Для параўнання прывяду прыклад. У Лондане, Нью-Ёрку, Бостане, гарадах, што прымаюць самыя буйныя марафоны, на старт выходзяць больш за 20 тысяч. Самы вялікі здолеў сабраць 27 тысяч чалавек. Таму для Мінска, маленькай Беларусі, для першага паўмарафону лічба ў 16 тысяч вельмі сур'ёзная.

— Ці атрымалася ў арганізатараў сабраць канкурэнтаздольных сапернікаў?

— З марафонскай эліты былі толькі наша Аляксандра Дуліба і ўкраінец Віталь Шафар, які перамог сярод мужчын. Бег таксама вядомы звышмарафонец Уладзімір Котаў. А так, калі адштурхоўвацца ад удзельнікаў, паўмарафон мне нагадаў чэмпіянат краіны.

— Што ж тады зрабіць, каб прывезці славутых афрыканцаў ці амерыканцаў?

— Мяркую, што даволі моцныя замежныя спартсмены падцягнуцца ў наступным годзе. Па вялікім рахунку 30 мільёнаў, якія атрымалі пераможцы, для паўмарафону добрыя грошы. Але каб прывезці тытулаваных бегуноў, пераможцаў Алімпійскіх гульняў і чэмпіянатаў свету, трэба панесці нямалыя грашовыя затраты. Аднак і сёлета замежнікаў сустрэлі добра, размясцілі для пражывання ў гасцініцы высокага ўзроўню.

— Дыстанцыя праходзіла праз цэнтр горада. Ці была яна камфортнай для бегу?

— Усе сышліся ў тым, што траса была цяжкаватая. Здавалася б, Мінск — горад не горны, але цэнтр увесь у горках. І 10-кіламетровае кола складалася са спускаў і пад'ёмаў. Атрымліваецца, беглі ўвесь час па няроўнасцях.

— А ці адчувалі падтрымку гледачоў?

— Хапала тых, хто апладзіраваў, крычаў, падказваў. Склалася ўражанне, што беглі ўсе. Нават гледачы. Афіцыйна ўдзельнічалі больш за 16 тысяч чалавек. Яшчэ каля трох тысяч далучыліся падчас забегу.

— Разам з вамі ў марафоне ўдзельнічаюць аматары, многія з якіх не вырашаюць спартыўных задач, а проста адпачываюць. Фатаграфуюцца падчас прабегу, кантактуюць з заўзятарамі. Ці дастаўляюць шэраговыя ўдзельнікі дыскамфорт прафесіяналам?

— Я не думаю, што прафесіянал будзе доўга бегчы разам з аматарамі і адчуваць нейкі дыскамфорт. Але ў Мінску зрабілі правільна, калі арганізавалі два колы, а не тры. Са мной аднойчы здарыўся не вельмі прыемны інцыдэнт. Я бегла «палавінку» з трыма коламі ў Польшчы. І так атрымалася, што апошняе кола прафесіяналы завяршалі разам з аматарамі. Перада мной было вельмі шмат людзей. Напрыканцы прыходзілася літаральна прадзірацца скрозь іх, гучна гаварыць, ляпаць па плячах тых, хто бег і слухаў музыку ў навушніках. У выніку я з кімсьці сутыкнулася і на самым фінішы саступіла кенійцы, з якой змагалася за перамогу.

— Для турыста такі масавы забег можа сведчыць аб тым, што ў нас даволі развітая культура бегу.

— Так, і дзякуючы гэтаму павышаецца аўтарытэт краіны. За апошнія пяць гадоў бег у нас увайшоў у моду, стаў прэстыжным заняткам. На Каменнай Горцы, дзе я жыву, па вечарах бегаюць даволі шмат людзей. Відавочна, што людзі прыйшлі з працы, універсітэта, надзелі звычайныя кеды і пабеглі па сцежках. Безумоўна, у Францыі, Польшчы бегавы рух з'явіўся даўно. Мы ў гэтым плане крыху спазніліся, аднак бег, паўтаруся, набірае папулярнасць.

«ТРЭНЕР АБЯЦАЎ, ШТО ПАЕДУ НА ЯМАЙКУ»

— Вы адразу пачалі бегаць доўгія дыстанцыі?

— Першапачаткова займалася спартыўнай хадой. Сама нарадзілася ў Казахстане, але пераехала з бацькамі ў Плешчаніцы, дзе і распачалася мая спартыўная кар'ера. Аднак з тэхнікай хады ў мяне нічога не атрымлівалася. Мне пастаянна на спаборніцтвах выносілі папярэджанні, дыскваліфікоўвалі. Гэта зламала, і я вырашыла пайсці ў марафон. І дзякуй Богу, што так атрымалася.

— Спартыўная хада не самы папулярны від спорту.

— Так і ёсць. Наша настаўніца па фізкультуры неяк правяла крос паміж шостымі і сёмымі класамі. Я перамагла. Для яе гэта было так нечакана, што яна адразу параіла мне пайсці займацца спартыўнай хадой. Маўляў, у цябе талент, яго трэба развіваць! Ну а трэнер вучылішча алімпійскага рэзерву мне паабяцаў, што на спаборніцтвы буду ездзіць у Францыю, палячу на Ямайку, куды, па яго словах, ужо ездзіла адна дзяўчынка з Плешчаніц. Ужо толькі з-за адной Ямайкі я была гатова пайсці ў секцыю.

— Першыя бегавыя красоўкі выдалі ў спартыўнай школе?

— Не. Так званыя «марафонкі» і «хадоўкі» заўжды каштавалі вялікіх грошай. На той момант, а гэта было гадоў чатырнаццаць таму, за іх трэба было заплаціць 50 долараў. Без дапамогі трэнера мне б іх бацькі не набылі. Але ён прыйшоў да нас, пачаў расказваць пра мае здольнасці, чэмпіянаты свету, пра тое, што мне патрэбен спецабутак. У выніку бацька паслухаў усе гісторыі і даў мне гэтыя грошы. Берагла красоўкі як зрэнку вока. Выступала ў іх гадоў пяць. Клеіла і перайклейвала. Ну а потым пачала зарабляць нешта сама і купіла новыя.

«ВЯСКОВАЯ ДЫСКАТЭКА ДАСЦЬ ФОРУ ГАРАДСКОЙ»

— Бацькі падтрымлівалі спартыўныя захапленні?

— А мне падаецца, яны нават не ведалі, што я займаюся спортам. Пакуль яны былі на працы, я паспявала прыйсці са школы, узяць форму і пайсці на трэніроўку.

— Чым, акрамя спорту, можна было займацца ў Плешчаніцах?

— Калі казаць пра адпачынак, любая вясковая дыскатэка яшчэ дасць фору сталічным клубам, — усміхаецца Вольга. — Але на танцы часу не было. Увесь час займалі трэніроўкі, зборы, спаборніцтвы. Ды і наогул, мне падаецца, што для Плешчаніц вучылішча алімпійскага рэзерву — гэта амаль адзіная магчымасць для таго, каб можна было кудысьці прабіцца.

— Ніколі не было жадання кінуць гэты спорт і займець новую прафесію?

— Усё расло, як камяк снегу. У дзяцінстве трэнер нешта абяцаў, пасля з'явіліся мары стаць алімпійскай чэмпіёнкай. Часу на думкі аб сыходзе не было. Праўда, калі ў жыцці бываюць пераломныя моманты (такія, як траўмы ў дарослым спорце), альбо сутыкаешся з несправядлівасцю, гэта ламае. Аднак кінеш красоўкі, панаракаеш, выплачаш усё, і пайсці, пакінуць гэту справу сам сабе не дазволіш. Марафон насамрэч даволі перспектыўны від лёгкай атлетыкі. І калі ты маеш жаданне, ставіш перад сабой мэты, шанц «зрабіць» сябе ёсць.

— І марафон, і спартыўная хада даволі складаныя віды спорту. Я бачыў, як ужо на фінішы спартсмены ад стомы падаюць і губляюць прытомнасць.

— Са мной падобнае здарылася на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы. Нешта змяшалася ў маёй галаве. Я паперабытвала кругі, раней фінішавала, аддала ўсе сілы, а аказалася, трэба бегчы яшчэ адзін круг… У прытомнасць прыйшла хутка. Аднак падобнае здарэцца, і гэта адзіны мінус у нашым спорце. З-за гэтага я супраць таго, каб фініш спартсменаў паказвалі па тэлебачанні. Я разумею, што СМІ хочацца перадаць публіцы нешта незвычайнае. І калі аператары бачаць, як у кагосьці, напрыклад, пайшла пена з роту, адразу бягуць і здымаюць. Але ніхто ад падобнага асалоду не атрымае. Публіка не павінна гэтага бачыць.

«КАНЦЭНТРАЦЫЯ І ЯШЧЭ РАЗ КАНЦЭНТРАЦЫЯ»

— Вольга, вы больш гадзіны знаходзіцеся на дыстанцыі. Увесь гэты час канцэнтруецеся выключна на бегу, альбо думаеце пра пабочныя рэчы?

— Не, выключна канцэнтруюся. У мяне часам пытаюцца: «Пра што ты думаеш, калі бяжыш?» Толькі пра тое, як перагнаць саперніцу ці ўцячы ад яе. Я ніколі не разглядаю славутыя мясціны, якія трапляюцца на дыстанцыі. Лонданскі марафон (Вольга сёлета ў ім заняла 9-е месца. — **Аўт.**) праходзіў па шыкоўных вуліцах, фініш быў каля каралеўскага палаца. Мы прабягалі пад Таўэрам. Калі вярталіся ў аэрапорт, менеджар расказваў і паказваў месцы, па якіх праходзіла траса. А я сядзела, глядзела і не магла нават узгадаць, што тут бегла.

— Вы сталі чэмпіёнкай першага маштабнага мінскага паўмарафону. Што далей?

— Рыхтуюся да Алімпіяды, якую ў наступным годзе прыме Рыа-дэ-Жанейра. Гульні — мая мара, да якой імкнулася ўсё жыццё. І мне вельмі хочацца падысці да іх на піку ўсёй сваёй жыццёвай кар'еры. Ну а ў лістападзе я буду ўдзельнічаць у Стамбульскім марафоне. Мэта адна — перамога.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

Сёння чарговая гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Свята, якое для старэйшага пакалення беларусаў было ў свой час галоўным, а для маладых людзей стала раздзелам у падручніку гісторыі. Пры ўсёй неадназначнасці стаўлення да гэтага дня бясспрэчным застаецца тое, што з яго пачалася цэлая эпоха, якая для многіх народаў, у тым ліку і для беларускага, стала лёсавызначальнай.

Аб ролі падзей кастрычніка 1917 года ў жыцці тагачаснай і сучаснай Беларусі, аб здабытках таго часу, што варта выкарыстоўваць сёння, каб развівацца далей, «Звязда» прапанавала выказацца вядомым айчынным гісторыкам.

ПРАРЫЎ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ АДБЫЎСЯ Ў 1917-м,

або Разважанні на тэму ўрокаў мінулага і дасягненняў сучаснага

Думкамі наконт ролі кастрычніка 1917-га ў гісторыі нашай краіны дзеліцца доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар МАРЗАЛЮК.

— Пачнем з таго, што «чырвоны дзень календара» для кожнага савецкага дзіцяці быў святам...

— Больш за тое, я ўдзельнік парада, прысвечанага 70-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пасля другога курса інстытута службу у Мінскім гарнізоне і з нагоды круглай святочнай даты чаканіў крок па вуліцах Мінска. У мяне нават засталася памяць — пазалочаны гадзіннік, якім я быў узнагароджаны, як удзельнік. Цяпер ён захоўваецца ў майго сына.

Безумоўна, як і большасці выхаваных у Савецкім Саюзе людзей, мне быў уласцівы савецкі патрыятызм. Я дагэтуль ведаю на памяць гімны БССР і СССР. Для мяне 7 лістапада ў дзяцінстве — гэта абавязкова парад, дэманстрацыя, эмоцыі. Гэта момант, калі я з бацькамі выязджаў у Мінскую вобласць да дзеда і бабы, або мы ўсёй раднёй сустракаліся на радзіме ў Магілёўскай вобласці. Як правіла, на кастрычніцкія святы адбываліся дзве важныя падзеі ў вясковым жыцці — калолі свінню і пачыналі паляваць на капытных жывёл *(смяецца)*.

— Наколькі моцна Кастрычніцкая рэвалюцыя паўплывала на сусветна-гістарычны працэс і як адбілася на лёсе нашай краіны?

— Гэта самая вялікая і эпахальная падзея XX стагоддзя, якая прадвызначыла развіццё ўсёй зямной цывілізацыі. Людзі, якія яе здзяйснялі, шчыра верылі ў тое, што яны робяць дабро. Яны сапраўды хацелі мадэрнізацыі, змен. А паколькі яны былі выхаваны ў, я сказаў бы, сацыял-дарвінісцкіх традыцыях, лічылі, што мэта апраўдвае сродкі. Насуперак выказванню, што марксізм — не догма, а кіраўніцтва да дзеяння, ён, на жаль, стаў догмай. У савецкім варыянце. Як гэта ні парадаксальна, марксізм, неамарксізм атрымаў жыццё менавіта ў заходнееўрапейскім свеце. Я з задавальненнем чытаю і Маркса, і Валерштайна, якога лічу найбольш геніяльным прадаўжальнікам гэтай ідэі. Марксісцкая філасофія, марксісцкая палітэканомія — гэта вялікая з'ява. Але, на жаль, у Савецкім Саюзе гэта ўсё было выдрана пад цытаты. На справе існавала адсутнасць палітычнай канкурэнцыі.

Для Беларусі па вялікім рахунку пасля рэвалюцыі пачаўся прарыў у будучыню — да незалежнасці краіны. Бо прыгадаем, што ні ў эпоху Расійскай імперыі, ні пасля лютаўскай рэвалюцыі нам не свяціла быць нават аўтаноміяй. Бальшавікі вымушаны былі і пайшлі да рэалізацыі ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэта каласальная рэч, бо, што б мы ні казалі, але менавіта ў савецкі перыяд былі закладзены асновы нашай сённяшняй дзяржаўнасці. Дзяржаўная тэрыторыя БССР, эканоміка, якая была створана ў эпоху СССР — без усяго гэтага мы сёння не былі б такімі, якія ёсць.

— Некаторыя нашы суседзі наогул адмаўляюцца ад савецкага мінулага...

— Для нас гэта значыць адмовіцца ад гісторыі ўласна Беларусі. Без савецкага мінулага мы не зразумеем, чаму сёння Беларусь стала незалежнай. Без БССР не было б сённяшняй Беларусі. Паліваць граззю савецкі праект я б не стаў, як і ідэалізаваць. Было па-рознаму. Самае сумнае, што рэвалюцыя, якая ў самым пачатку апелявала да свабоднага развіцця асобы, прывяла да яе запрыгоньвання. Гэта яшчэ адзін яскравы прыклад, як апеляцыі да свабоды, якія ажыццяўляюцца гвалтоўнымі метадамі, прыгнятаннем тых, хто не хоча думаць так, як ты, прыводзіць да яшчэ большай несвабоды.

— Што вы параілі б пачытаць сённяшняй моладзі, каб зразумець сутнасць тых часоў?

— Існуе шмат твораў мастацкай літаратуры, у тым ліку і савецкіх, у якіх няма ніякага прыхарошвання. Ёсць добрая кніга пра трагедыю чалавека, якога нам так не хапае ў Беларусі па сённяшні дзень — актыўнага і прадпрымальнага, які прывык сваімі рукамі, без дапамогі дзяржаўных датацый будаваць нармальную гаспадарку. Вялікі беларускі пісьменнік Кузьма Чорны напісаў аповесць пра Лявона Бушмара. Гэтую кнігу ўсе савецкія дзеці чыталі, але з іншымі акцэнтамі.

— На думку гісторыка, ці ўлічыла наша краіна гістарычны вопыт тых падзей?

— Калі казаць пра сённяшні дзень, то рэспубліка, з майго пункту гледжання, імкнецца выбіраць найбольш аптымальны варыянт свайго развіцця, улічваючы ўрокі савецкага мінулага. З аднаго боку, мы за прыватную ініцыятыву, за правядзенне рэформаў, сацыяльных трансфармацый, з другога боку, памятаючы, што адбываецца, калі 95 працэнтаў народу жыве ў галечы, а астатнія з'яўляюцца мільярдэрамі, мы па міліметры ашчадна выбіраем сацыяльна арыентаваную мадэль свайго развіцця. Нягледзячы на цяжкасці, на тое, што не ўсё атрымліваецца з першага разу (бо не памыляецца той, хто не робіць), мы імкнёмся будаваць грамадства, дзе Канстытуцыяй і заканадаўствам краіны абаронены найбольш уразлівыя слаі насельніцтва — дзеці, старыя і гэтак далей. Нас не раз крытыкавалі за тое, што мы недзе паволі, недзе па міліметры адпускаем сваю эканоміку. Чаму ў нас дастаткова арыгінальны ў параўнанні з постсавецкімі краінамі шлях? Таму што мы разумеем адну простую ісціну: немагчыма назваць паспяховай тую краіну і той народ, дзе ўсё пабудавана на каласальным сацыяльным разрыве, велізарнай сацыяльнай дыстанцыі. Мы за свабоду, за ініцыятыву, за дынамічнае развіццё рыначнай эканомікі. Сацыяльныя гарантыі і прынцыповая роўнасць грамадзян — гэта тое, без чаго не магчымае наша нармальнае развіццё і не магчымая наша будучыня. Таму, калі казаць пра развіццё Беларусі сёння, яно якраз абумоўлена гэтымі фундаментальнымі прынцыпамі. Грамадства, якое не думае пра слабых, абяздоленых, асуджана на непаспяховасць. Беларусь рэалізавалася сёння як самастойная дзяржава, якая сама, без чужых падказак, імкнецца выбудоўваць сацыяльна-эканамічную і палітычную мадэль, у аснове якой — чалавек, яго правы на годнае жыццё, а не існаванне на мяжы голаду, страху і занядбання. Мы добрыя вучні, бо добра засвоілі тыя ўрокі, што былі ў 1917 годзе.

Пытанні задавала Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

«Зімні ўзяты». Мастак У.А. Сяроў (1954).

СВЯТА ПЕРАЕМНАСЦІ

Як гісторык і грамадзянін, я не з'яўляюся прыхільнікам рэвалюцый. Грамадства павінна развівацца эвалюцыйным шляхам. Як правіла, любая рэвалюцыя вядзе да злому існуючай сістэмы функцыянавання дзяржавы і грамадства. У выніку патрабуецца шмат часу і намаганняў, каб стварыць новы дзейсны механізм жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства.

У гэтым кантэксце нельга не адзначыць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года прывяла да кровапралітнай грамадзянскай вайны, крывавага «чырвонага» і «белага» тэрору. Але, разам з тым, яна адкрыла новыя перспектывы ў жыцці грамадства былой Расійскай імперыі. Яе вынікам сталі глабальныя геапалітычныя змены ў свеце.

Мы не павінны таксама забывацца, што як ідэя аўтаномнага ўладкавання Беларусі, так і ідэя стварэння незалежнай беларускай дзяржавы пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года атрымалі магчымасць для далейшага развіцця. Але толькі на праграмна-тэарэтычным і дэкларацыйным узроўнях. Пасля ж перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі пытанне беларускай дзяржаўнасці было пераведзена ў плоскасць практычнай палітыкі. У выніку беларускі народ атрымаў права на самавызначэнне, адбылося практычнае ўвасабленне ідэі беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове ў форме БССР. Беларуская савецкая дзяржаўнасць стала рэальнасцю. БССР выступіла ў якасці адной з краін-заснавальнікаў шматнацыянальнага СССР. У створанай федэратыўнай дзяржаве Савецкая Беларусь, як і іншыя рэспублікі — суб'екты федэрацыі, па форме з'яўлялася дзяржавай, хаця магчымасці ў рэалізацыі дэкларанага суверэнітэту заканамерна былі абмежаваны Канстытуцыяй СССР. Міжнародным прызнаннем беларускай дзяржаўнасці стала ўключэнне БССР у лік дзяржаў-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, 70-годдзе стварэння якой мы зусім нядаўна адзначылі.

Сучасная Рэспубліка Беларусь з'яўляецца пераемніцай БССР, а гэта значыць, што абвешчанае савецкай уладай права нацый на самавызначэнне з'яўляецца фундаментам і сённяшняй незалежнай Беларусі. У нас створана моцная дзяржава з эфектыўнай уладай, якая дзейнічае ў інтарэсах народа, абапіраецца на сістэму Саветаў дэпутатаў розных узроўняў, а таксама мае сацыяльна арыентаваную эканоміку, высокаразвітыя адукацыю, навуку і культуру. Усё гэта шмат у чым грунтуецца на патэнцыяле, назапашаным у часы БССР.

Акрамя таго свята 7 лістапада, якое ў савецкі час стала традыцыйным для нашага грамадства, у сучаснай Рэспубліцы Беларусь напоўнілася новым стваральным зместам. Менавіта да гэтага свята ў незалежнай Беларусі, па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, як правіла, прымяркоўваецца адкрыццё новых ці рэканструяваных сацыяльна значных аб'ектаў (станцый метро, дзіцячых садкоў, кінатэатраў, спартыўных комплексаў, медыцынскіх устаноў і г.д.).

Таму, на мой погляд, сёння ўжо можна гаварыць аб тым, што дэ-факта свята 7 лістапада ў нашай краіне пераўтварылася са свята рэвалюцыйнага ў свята гістарычнай пераемнасці і стваральнай працы на карысць грамадства.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

МЫ АДЭКВАТНА ПАСТАВІЛІСЯ ДА ЗДАБЫТКАЎ МІНУЛАГА

Беларусь — адна з нешматлікіх постсавецкіх краін, якая працягвае адзначаць Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нават больш за тое — прызнае дзяржаўным святам. Чаму, у адрозненне ад іншых рэспублік, мы не забыліся на яго? Што дала беларускаму народу савецкая эпоха? Пра гэта і не толькі спецыяльна для «Звязды» паразважаў Сяргей ТРАЦЦЯК, кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:

— Нацыянальная беларуская дзяржава ўпершыню адбылася менавіта ў савецкай форме. Парадокс, але тыя, хто ўпарта змагаўся супраць самавызначэння беларусаў як асобнага народа, упарта адмаўляў неабходнасць незалежнай беларускай рэспублікі, яе і стварылі. Спачатку як буферную, каб аддзяліць савецкую Расію ад капіталістычнага Захаду, і ў хуткім часе, на працягу аднаго-двух гадоў, яна набыла нацыянальную плоць і кроў і стала ў рэшце рэшт тым П'емонтам, кажучы словамі класікаў еўрапейскага нацыяналізму, вакол якога сабраліся беларускія землі.

Маленькая рэспубліка другога абвяшчэння, якая пасля Рыжскага міру 1921 года кантралявала толькі шэсць паветаў былой Мінскай губерні, у 1924—1926 гадах сабрала вакол сябе практычна ўсю Усходнюю Беларусь і аднавіла па сутнасці тую граніцу, якая існавала паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Расіяй, пачынаючы з сярэдзіны XVI стагоддзя і да першага падзелу Рэчы Паспалітай. А ў 1939 годзе адбылося аднаўленне гістарычнай справядлівасці. Грабежніцкі для Беларусі Рыжскі мір быў скасаваны, і наша краіна ізноў стала адзінай дзяржавай — Заходняя Беларусь уз'ядналася з Усходняй і Цэнтральнай. Адбылося ўз'яднанне беларускага народа.

Савецкая эпоха зрабіла беларусаў адным з трох вялікіх народаў, на якім трымаўся Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Так і пералічвалі: рускі, украінскі і беларускі вялікія народы. У самым фінале савецкай эпохі, з пачатку 1980-х гадоў, да гэтай трыяды ўпарта імкнуліся далучыцца некаторыя іншыя, але Савецкаму Саюзу не было адпушчана столькі часу.

Тая Беларусь, у якой мы сёння жывём, індустрыялізаваная, урбанізаваная, з адукаваным і культурным насельніцтвам, як яе яшчэ называюць, самая еўрапейская з усходнеславянскіх рэспублік і краін постсавецкай прасторы, — прадукт савецкай эпохі. Безумоўна, мы пайшлі далей. Мы помнім і свята ставімся да савецкай мінуўшчыны, але перараслі савецкі светапогляд, што дазваляе рухацца наперад.

У Беларусі савецкая праграма індустрыяльнай мадэрнізацыі дала найбольшы эфект у 1960—1980-я гады, калі палова насельніцтва стала прамысловымі рабочымі. Яна карэнным чынам адрознівалася ад класічнай заходняй мадэрнізацыі тым, што абапіралася на салідарныя структуры ў грамадстве. Капіталістычная мадэрнізацыя ў той жа час разбурала старыя дабуржуазныя, традыцыйныя салідарныя структуры і стварала індывідуалізаваную асобу — чалавека найперш за ўсё разумна эгаістычнага. Сучасная Беларусь у сваёй мадэрнізацыйнай палітыцы імкнецца спалучыць элементы кожнага з гэтых супрацьлеглых падыходаў.

Палітыка ў культурнай сферы краіны шмат у чым звязана з той, што праводзілася ў савецкія часы. БССР 1960—1980-х гадоў была ўключана ў агульнасавецкі народнагаспадарчы, навукова-культурны комплекс, мела прамы выхад на замежжа. На ўзроўні нізавым, паўсядзённай культуры, пераходзіла на рускую мову і русіфікавалася. Пры гэтым беларусы ніколі не лічылі сябе рускімі. Але, што тычыцца тэлебачання і радыё, яно ў той час было суцэльна беларускамоўным. І ўвогуле, падтрыманне беларускамоўнасці праводзілася за кошт дзяржаўных датацый. Сёння таксама праводзіцца курс мяккай беларусізацыі, але ва ўмовах рынкавай эканомікі гэта справа робіцца больш складанай.

Беларусы неабыякавы да таго, што адбываецца ў іншых рэспубліках былога СССР. Мы працягваем разглядаць іх як частку былой Радзімы. Бо пераплецены з імі і роднаснымі сувязямі, і асабістымі, і культурнымі. Нягледзячы на тое, як нашы жыхары ставяцца да канфліктуючых бакоў ва ўкраінскай грамадзянскай вайне, душа баліць у кожнага. А гэтая вайна да таго ж прайшлася і шмат па якіх беларускіх сем'ях...

Увогуле, у апошнія гады разбурыўся стэрэатып, што Беларусь — самая савецкая з «постсавецкіх» краін. Год таму, калі Крым увайшоў у склад Расійскай Федэрацыі, аказалася, што самай савецкай часткай былога СССР з'яўляўся ён. Менавіта Крым, а найбольш за ўсё — Севастопаль, на сучасным этапе стаў сапраўдным запаведнікам практычна некранутых савецкіх каштоўнасцей, сацыякультурных і палітыка-ідэалагічных стэрэатыпаў. Беларусы ж за час незалежнасці згубілі рамантычнае стаўленне да савецкасці, але адэкватна паставіліся да здабыткаў СССР і скарысталі тое станоўчае, што ў свой час дала савецкая эпоха.

Запісала Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»,

опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:

«...стоимость **1 кв.м** для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир, площадью **83,08 кв.м**, на 12 этаже – **1250 (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США,** квартир площадью **65,44 кв.м**, на 8-м этаже – **1300 (одна тысяча триста) долларов США**; нежилого помещения №13 на 1-м этаже, площадью **87,88 кв.м – 2200 (две тысячи двести) долларов США».**

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.

УНП 191061436

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 3845634, 4299413, 3853102, серии СВ № 0189150 и бланк полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ № 1186887. УНП 100782388

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 ноября 2015 года проводит 1А от 25 августа 2015 года повторный открытый аукцион по продаже имущества

Номера лотов	Наименование имущества	Износ %	Начальная цена торгов, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Легковой автомобиль «Ниссан Теана», регистрационный знак 1010 МН-7	47, 9	128 751 774	13 000 000

Адрес нахождения имущества: г. Минск, ул. Карвата, 88.

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении ГВТУП «Белвнешпромсервис».

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 26 ноября 2015 г. в 11.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 23 ноября 2015 года**.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **26 ноября 2015 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь в течение **10**-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, обеспечение штрафа и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.

Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Могилевское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» 18.11.2015 г. проводит повторный открытый аукцион с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевхимволокно»

		Адрес	Начальная цена продажи с учетом НДС, руб.,
ЛОТ №1 Сведения об имуществе, входящем в состав лота	**Капитальное строение с инв. № 700/С-49068 – Главный корпус ДМТ-2,** общ. пл 20 455,0 кв.м Земельный участок с кадастровый номером 740100000005004841, площадь 0,9922 га	г. Могилев, пр-т Шмидта, 45	**5 885 644 800**
ЛОТ №2 Сведения об имуществе, входящем в состав лота	**Капитальное строение с инв. № 700/С-49089 – Корпус промежуточных емкостей ДМТ-2,** общ. пл. 3084,9 кв.м Земельный участок с кадастровый номером 740100000005004842, площадь 0,6635 га	г. Могилев, пр-т Шмидта, 45/32	**1 178 956 800**
ЛОТ №3 Сведения об имуществе, входящем в состав лота	**- Капитальное строение с инв. № 700/С-74544 – Производственные площади прядильно-отделочного цеха № 1 ЗСВ, Производственные площади цеха нетканых материалов № 1,** общ. пл 49 487,9 кв.м - Вспомогательные сооружения согласно перечня; Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000005001828, площадью 222,9991 га	г. Могилев, пр-т Шмидта, 45	**34 785 623 698**
ЛОТ №4 Сведения об имуществе, входящем в состав лота	**Капитальное строение с инв. № 700/С-50509 – Здание главного корпуса тарного цеха ТСП, Участок пошива упаковочной тары, Зарядная тарного цеха, Подсобные помещения 4,5х20х3,5;** общ. пл. 4528,0 кв.м - Вспомогательные сооружения согласно перечня; Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000005001828, площадью 222,9991 га	г. Могилев, пр-т Шмидта, 45	**1 932 096 153**
ЛОТ №5 Сведения об имуществе, входящем в состав лота	**- Изолированное помещение с инв. № 700/D-129313 – Помещение изолированное бытового корпуса с медпунктом,** общ. пл. 4860,3 кв.м - Вспомогательные сооружения согласно перечня; Земельный участок с кадастровый номером 740100000003006371, площадь 0, 9474 га	г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105Д-2	**4 276 716 329**
Сумма задатка и расчетный счет для его внесения	**Задаток в размере 5% от начальной цены лота** перечисляется на р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509, получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»		
Продавец	**ОАО «Могилевхимволокно»**		
Организатор аукциона	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» МОУ, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29**		
Дата, время и место проведения аукциона	**18 ноября 2015 года, 12.00, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29 (офис МОУ Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»)**		
Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе и внесения задатка	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» МОУ, г. Могилев, ул. Лазаренко, 29, 17 ноября 2015 года до 15.00 включительно**		
Условие аукциона	Победитель аукциона обязан в течение 2 месяцев со дня регистрации перехода права собственности на капитальное строение выполнить работы по устройству ограждения по периметру приобретенного земельного участка.		
Извещения о предыдущих аукционах были размещены в газете «Рэспублика» в номерах от 02.07.2015 г., 05.08.15 г., 04.09.15 г., 07.10.15 г.			

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (8-0291) 400-394 vel.; (8-029) 624-26-25; bti9@inbox.ru

ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Узденского района Минской области

10 декабря 2015 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж) в 11.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительств и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. руб.)
Лот № 1	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 25	0,1500	625680202201000278	90 000 000	10 227 000
Лот № 2	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 26	0,1464	625680202201000279	90 000 000	10 842 900
Лот № 3	Дещенский сельисполком	д. Городище, ул. Центральная, уч. 2А	0,1332	625680203401000037	90 000 000	11 957 200
Лот № 4	Дещенский сельисполком	д. Теплень, ул. Новая, уч. 18А	0,1482	625680213201000197	90 000 000	11 957 200
Лот № 5	Дещенский сельисполком	д. Яченка, ул. Центральная, уч. 71	0,1500	625680215801000167	90 000 000	11 957 200

Целевое назначение участков — для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3641062500114 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 филиала 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 601068832, код платежа — 04901.

Граждане, желающие учавствовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **по 04 декабря 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителям гражданина — нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация — с 10.30 до 10.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам: (801718) 35111, 35135, 35151

■ Аўтарытэтна

Уладзімір ГУСАКОЎ:

«АКАДЭМІЯ ПАВІННА ВЫРАШАЦЬ САМЫЯ АМБІЦЫЁЗНЫЯ ЗАДАЧЫ»

Старшыня Нацыянальнай акадэміі навук — пра стратэгічныя інтарэсы, «рэкламу» навукі і «божую іскру»...

Навука — асаблівая сфера працы, у якой кожны ўкладзены рубель можа даць эфект у дзесяткі і сотні рублёў. На выставе-кірмашы дасягненняў айчыннай навукі, што прайшоў у пачатку восені, было прадстаўлена больш як паўтысячы інавацыйных распрацовак інстытутаў і прадпрыемстваў Нацыянальнай акадэміі навук. Асноўнай яе мэтай было актывізаваць камерцыялізацыю вынікаў працы беларускіх навукоўцаў.

Наколькі актыўна акадэмічная навука інтэгруецца ў эканоміку краіны, ці можна разбагацець, займаючыся ёю, і ці патрэбна навуцы масавасць? Пра ўсё гэта мы гутарым са старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, акадэмікам Уладзімірам ГУСАКОВЫМ.

ВЫГАДНА ЎКЛАСЦІ КАПІТАЛ

— Уладзімір Рыгоравіч, некаторыя лічаць, што навука «сядзіць на шыі» ў дзяржаўнага бюджэту. Ці можна лічыць Акадэмію навук самадастатковай у фінансавым плане?

— Нацыянальная акадэмія навук — арганізацыя шматпрофільная. У адрозненне ад галіновых міністэрстваў і ведамстваў, якія канцэнтруюць свае намаганні на развіцці нейкага аднаго канкрэтнага напрамку, акадэмія вымушана адначасова займацца як эканомікай краіны ў цэлым, так і практычна ўсімі галінамі і напрамкамі. Акрамя таго, мы займаемся яшчэ і вытворчасцю навукаёмістай прадукцыі. У нас дзейнічае каля трох дзясяткаў прадпрыемстваў самай рознай спецыялізацыі.

Фактычна Нацыянальная акадэмія навук — гэта ўжо навукова-вытворчая карпарацыя (буйное аб'яднанне навукоўцаў і работнікаў вытворчасці), здольная вырашаць самыя складаныя як навуковыя, так і практычныя задачы. Кіруючыся дзейнымі методыкамі разліку, магу сказаць, што ўкладзеныя ў навуку сродкі і інвестыцыі акупляюцца шматразова — на кожны рубель прыпадае ад 8—10 да 40 рублёў прыбытку і больш. Навука, мабыць, — самае выгаднае ўкладанне капіталу. Вось чаму ва ўмовах эканамічнага крызісу многія развітыя краіны скарацілі выдаткі па большасці кірункаў дзейнасці, акрамя навукі. Фінансаванне навуковых даследаванняў і распрацовак, наадварот, павялічылася. І гэта, як відаць з сусветнай практыкі, з'яўляецца гарантыяй пераадолення складаных крызісных умоў.

Мы вельмі асцерагаемся, каб Беларусь не трапіла ў татальную імпартную залежнасць, асабліва ў тэхніцы і тэхналогіях.

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі ў апошнія гады акцэнтавала ўвагу на пашырэнні гасразліковай дзейнасці. Бюджэтныя сродкі складаюць толькі чвэрць неабходных аб'ёмаў фінансавых рэсурсаў, якія, як я ўжо казаў, шматразова акупляюцца. А ўсе астатнія фінансавыя рэсурсы акадэмія павінна зарабіць сама. Таму мы актыўна ўдзельнічаем ва ўсіх дзяржаўных праграмах і праграмах развіцця галін, праграмах Саюзнай дзяржавы, інавацыйных праектах міністэрстваў, ведамстваў і прадпрыемстваў. Выконваем заказы беларускіх арганізацый і прадпрыемстваў, прыцягваем замежныя гранты, працуем сумесна з замежнымі навуковымі цэнтрамі і навукоўцамі, знаходзім замежныя праекты і заказы і гэтак далей. І, вядома, ствараем і пашыраем уласную вытворчасць. Гэта дае нам усе падставы заяўляць, што Акадэмія — не ўтрыманец. Да нас бясконца ідуць даручэнні і заказы на выкананне канкрэтных даследаванняў або распрацовак. Напрыклад, толькі зваротаў дзяржаўных органаў штогод паступае больш за 3 тысячы.

НЕ ТРАПІЦЬ У ЗАЛЕЖНАСЦЬ

— Кожны год акадэмія фарміруе ТОП-100 распрацовак для прамысловасці і ТОП-10 дасягненняў беларускай навукі. Якія з самых буйных беларускіх распрацовак апошняга часу вы маглі б узгадаць?

— Часта кажуць пра ваенную, энергетычную, эканамічную і харчовую бяспеку, але чамусьці забываюць пра навукова-інавацыйную. Між іншым менавіта навукова-інавацыйная бяспека ці не самая галоўная! Калі стаўка робіцца на імпарт навуковых дасягненняў і распрацовак, то эканоміка краіны становіцца вельмі ўразлівай, залежнай ад знешняй кан'юнктуры. З сусветнага досведу вядома, што замежныя пастаўшчыкі проста саджаюць слабаразвітую ў навуковым плане эканоміку на імпартную «іголку» і не даюць з яе саскочыць. А ў выпадку змены курсу стратэгіі імперцэры дыктуюць свае ўмовы — дыскрымінацыйныя і рабаўніцкія. Гэтаму ёсць маса прыкладаў. І самы наглядны — санкцыі Захаду супраць Расіі. Таму мы вельмі асцерагаемся, каб Беларусь не трапіла ў татальную імпартную залежнасць, асабліва ў тэхніцы і тэхналогіях.

Што тычыцца найбуйнейшых беларускіх распрацовак апошняга часу, варта згадаць суперкамп'ютар «СКІФ», які ўваходзіў у лік 300 найбольш магутных камп'ютараў у свеце. На яго базе ў апошнія гады створана цэлая серыя больш сучасных і тэхналагічных камп'ютараў рознага прызначэння. Касмічны спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання зямлі, які даў магчымасць Беларусі ўвайсці ў міжнародны клуб касмічных дзяржаў і цяпер забяспечвае патрэбы ў касмічных здымках многіх міністэрстваў і ведамстваў. Дарэчы, навукоўцы акадэміі прыступілі да працы ўжо над новым, больш дасканалым спадарожнікам. Прарывам у сваёй галіне стала стварэнне беспілотнага лятальнага апарата, які мае самыя канкурэнтаздольныя характарыстыкі. Выраблена ўжо цэлая серыя апаратаў самага рознага прызначэння, якія, між іншым, пастаўляюцца і за мяжу.

Мы ганарымся стварэннем у Акадэміі Цэнтра клетачных тэхналогій, распрацоўкай спецыяльных методык і спосабаў лячэння складаных захворванняў і асабліва ран з дапамогай ствалавых клетак самога чалавека. У нас распрацавана серыя найноўшых прадуктаў харчавання функцыянальнага прызначэння (для спартсменаў, жанчын, дзяцей, людзей з пэўнымі захворваннямі), здольных карэнным чынам аздараўляць людзей. Створаны шэраг арыгінальных лекавых сродкаў, якія не саступаюць па сваёй эфектыўнасці найлепшым сусветным аналагам, але застаюцца даступнымі па цане, прычым пры іх вытворчасці выкарыстоўваюцца айчынныя субстанцыі. Стварэнне RFID-ідэнтыфікацыі, а разам з ёй цэлай сістэмы кантролю якасці і сапраўднасці тавараў, дазваляе нам сёння не дапусціць на наш рынак падробкі і няякасную прадукцыю.

Дасягненні айчыннай геномікі сталі асновай новых метадаў селекцыйнай працы. ДНК-маркеры паспяхова выкарыстоўваюцца для ідэнтыфікацыі і пашпартызацыі сартоў раслін. Яшчэ адзін цікавы напрамак працы — стварэнне генетычных пашпартоў здароўя. Яны змяшчаюць інфармацыю аб наяўнасці пэўных генаў, якія абумоўліваюць схільнасць канкрэтнага чалавека да развіцця мноства захворванняў. Пералік распрацовак Акадэміі навук на гэтым не заканчваецца. Мы працуем ва ўсіх сферах, і паўсюдна ў нас ёсць знакавыя і прарыўныя вынікі.

ЛІКВІДАВАЦЬ ПЕРАГІБЫ

— А як вы лічыце, ці не занадта мы захапляемся эканамічным эфектам? Ёсць і іншая думка: нельга зводзіць навуку толькі да прыкладных вынікаў. Дзяржава павінна падтрымліваць у тым ліку і фундаментальныя даследаванні...

— Вы маеце рацыю — без апераджальнага развіцця фундаментальных даследаванняў сапраўдная навука існаваць не можа. У адваротным выпадку навукоўцы могуць ператварыцца ў распрацоўшчыкаў прыватных прыкладных задач — без бачання навуковых перспектыў. У апошнія гады ад Акадэміі навук і навукі ўвогуле патрабавалі пераважна практычную выніковасць. І мы адчуваем, што адбыўся істотны перагіб навукі ў бок практычнага і гасразліковага эфекту. Некаторыя традыцыйныя фундаментальныя і тэарэтычныя даследаванні, дзе Нацыянальная акадэмія традыцыйна была моцная, сталі згасаць. Аслаблі нацыянальныя навуковыя школы, напрыклад, у галіне мікраэлектронікі, робатызацыі, машынабудавання, кагнітыўных тэхналогій, функцыянавання розных сістэм чалавечага арганізма і іншыя.

Для ліквідацыі прабелаў, што ўтварыліся, мы цяпер у тэрміновым парадку фарміруем у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі своеасаблівыя кластарныя структуры, задача якіх сканцэнтраваць і мабілізаваць творчы патэнцыял вучоных усёй краіны, і перш за ўсё моладзі, на рашэнне найбольш перспектыўных задач сусветнага парадку. Гэта значыць, што паўстала вострая неабходнасць стварыць у Акадэміі навук аб'яднанні навукоўцаў для выпрацоўкі стратэгічных напрамкаў навуковага развіцця. Паралельна працуем над тым, каб мець усе ўмовы хуткага прасоўвання беларускай навукі ў тых галінах, якія найбольш дынамічна развіваюцца ў свеце.

На кожны рубель прыпадае ад 8—10 да 40 рублёў прыбытку і больш. Навука, мабыць, — самае выгаднае ўкладанне капіталу. Вось чаму ва ўмовах эканамічнага крызісу многія развітыя краіны скарацілі выдаткі па большасці кірункаў дзейнасці, акрамя навукі.

Фундаментальныя даследаванні павінны фінансавацца пераважна за кошт бюджэтных сродкаў, а для пашырэння тэматыкі тэарэтычнай накіраванасці памеры дзяржаўнай падтрымкі навукі, бясспрэчна, неабходна павялічваць. Заработная плата вучоных — толькі адзін з артыкулаў выдаткаў. Важна таксама набываць сучасныя дарагія прыборы і абсталяванне, многія з якіх Акадэмія навук самастойна купіць не можа. А без найноўшага абсталявання вынікі даследаванняў, па меркаванні сусветнай навукі, не заўсёды могуць быць прызнаныя як дакладныя і абсалютна даказаныя.

НЕ АДСТАЦЬ У СФЕРЫ БІЯТЭХНАЛОГІЙ

— А ў якой стадыі знаходзіцца сёння стварэнне навукова-тэхналагічнага парка «БелБіяград»?

«ВОСЕНЬ» І ЯЕ СВІТА

Музыка беларускіх кампазітараў на філарманічнай сцэне

«Беларуская музычная восень» — гэта музыка лістапада. Амаль увесь месяц нас чакаюць канцэрты, выканаўцы, якія даносяць да нас думкі людзей, якім дадзена здольнасць выказвацца на мове музыкі. Яна ўніверсальная, але... Ёсць гучанне, уласцівае Беларусі. Яго мог перадаваць, у прыватнасці, кампазітар Юрый Семяняка, аўтар опер і песень, якія ўспрымаюцца ў нас таксама як класіка беларускай музыкі. Беларуская класіка сёлета задае тон фестывалю, які ладзіцца ў Белдзяржфілармоніі.

Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя Жыновіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца мае бязлітасна магчымасцяў, каб перадаць лірызм і тонкую пачуццёвасць, унутраную энергію і шматгалоссе, уласцівае беларускаму жыццю, якое ўлавіў Юрый Семяняка.

Тое, што ў Беларусі паэтычная (і меладычная) душа, гэты аркестр пакажа яшчэ раз падчас «Беларускай музычнай восені», 10 лістапада. І дапамогуць у гэтым выдатныя паэты Рыгор Барадулін і Генадзь Бураўкін. Канцэрт-мемарыял у іх памяць задуманы такім чынам, каб прагучалі вершы творцаў у іх жа выкананні. Але паэзія будзе гучаць пад музыку — песні на іх словы. Паэзія можа гучаць і ў музыцы: у аркестравых творах, мэта якіх — стварыць адпаведны настрой. Паводле задумы аўтара праекта Міхаіла Казінца, сімфонія «Полацкія пісьмёны» Андрэя Мдзівані, выкананая Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам, падкрэслівае маштаб асоб сучасных беларускіх паэтаў, якія не страцілі сувязі з традыцыямі і культурай зямлі, на якой прыйшлі ў жыццё.

«Традыцыі і сучаснасць» — назва канцэрта Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». Але свой вечар задумаў Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь. Яшчэ штосьці ад народа: канцэрт Беларускага ансамбля народнай музыкі «Свята». І маштабнае: Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Шырмы адзначыць сваё 75-годдзе. У той жа час дзіцячая філармонія адзначыць не дзіцячую, а сур'ёзную дату — 55 гадоў. І, тым не менш, з дзіцячым імпэтам, адпаведным узросту свайго слухача. Наогул усе найлепшыя творчыя сілы краіны, калектывы і выканаўцы, паважаныя і маладыя (нагода для адкрыццяў!) сёлета натхняюць нашу восень — і гэта, бадай, падобна на агляд самых лепшых музычных сіл, якія мы маем. Але ці ўсведамляем?

Вось дзеля ўсведамлення таго, якіх класных майстроў музыкі мы маем, айчынныя творцы традыцыйна выступалі ў рамках «Беларускай музычнай восені» разам з замежнымі музыкантамі. Таму праграма сёлета насычаная: больш за 20 канцэртаў абяцае мастацкі кіраўнік «Белдзяржфілармоніі» Юрый Гільдзюк. Міжнародны фестываль скіраваны на тое, каб знаёміць з выдатнымі ўзорамі сусветнай музычнай спадчыны і выканальніцкага мастацтва. Таму ў асобным канцэрце сёлета ўзгадаюць славутую оперную спявачку, народную артыстку СССР Ірыну Архіпаву, якая была частай госцей на музычных імпрэзах у Беларусі. І сучасныя музыканты з іншых краін выступяць на фестывалі ў Беларусі: народны артыст Расіі скрыпач Максім Фядотаў, заслужаная артыстка Расіі піяністка Галіна Пятрова, заслужаны артыст Расіі віяланчэліст Кірыл Родзін, піяністка з Грузіі Элісо Балквадзэ, арганіст з Італіі Эўджэніа Марыя Фаджыяні. Але цікавае супрацоўніцтва фінскай арганісткі Юліі Тамінен і беларускага ансамбля «Камерата», які вылучаецца ўменнем стварацьасаблівыя гукі голасам, — у іх версіі «Подых планеты», які можна адчуць у гэтыя асенніе дні ў Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ Паглядзім

АЙ, БАЛІЦЬ...

Лячыцца лепш операй

«Айбаліт» — гэта не толькі імя персанажа Карнея Чукоўскага, але і назва оперы беларускай кампазітаркі Марыны Марозавай, створанай паводле лібрэта Таццяны Мушынскай. І дзіцячы спектакль у пастаноўцы рэжысёра Міхаіла Панджавідз, які з'явіўся на пачатку месяца ў афішы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

Тут не Афрыка, але пра добрага доктара, які цудоўна лечыць усіх, хто б да яго ні звярнуўся, марыць ці не кожны. Прычым з дзяцінства, калі толькі чыталі вершыкі пра Айбаліта, сапраўды добрага чалавека і героя, здольнага перамагчы Бармалея. Як жа гэта актуальна — разуменне сутнасці дабра і зла прыходзіць з маленства. У тым ліку з кніжак, якія чытаюць малому бацькі. Ці спектакляў, на якія ходзяць усёй сям'ёй. Разуменне мастацтва — гэта таксама ў нейкім сэнсе разуменне дабра, у гэтым выпадку найперш праз музыку. Музычныя ідэі Марыны Марозавай увасобіў аркестр тэатра на чале з дырыжорам-пастаноўшчыкам Алегам Лесуном.

Таму дзіцячая опера — справа адказная і складаная. Спачатку трэба герояў звесці ў такую лінію, каб за іх стасункамі было цікава назіраць. Потым кожны з герояў «абрастае» сваёй мелодыяй, якая вызначае яго характар, паводзіны, мэты. І далей проста неабходна, каб партыі герояў стварылі ў маленькіх гледачоў адчуванне, што ім пра нешта распавядаюць, каб тое, што адбываецца на сцэне, уцягвала і заварожвала. Казка — лепшы сродак прыварожыць малых да оперы, каб яны прынялі гэты від мастацтва назаўсёды. Казачную прастору імкнуліся стварыць мастакі па касцюмах Кацярына Булгакава і Марыя Мароз — паводле ўсёй гісторыі, створанай аўтарамі, прыгожых і цікавых цацачных герояў даволі шмат — як пацыентаў у доктара. Здаецца, лепш за ўсё гэта адчуваюць дарослыя. Але рэжысёр Міхаіл Панджавідзэ імкнуўся ўзмацніць эфект, прапаноўваючы такія хады, каб бацькам, якія суправаджаюць дзетак у тэатр, было не сумна ў тым ліку з-за таго, што яны нейкія сітуацыі пазнаюць, на нешта ім намякаюць, а яшчэ штосьці паказваюць (далёка ж не ўсе дзеці, на якіх разлічана опера, могуць, напрыклад, чытаць). Праз гэта, дарэчы, дарослых можна прыцягнуць да оперы — глядзім, потым на дарослы спектакль прыйдуць.

Таму гэты доктар Айбаліт — «сямейны». І невядома яшчэ, каго трэба больш вучыць адчуваць дабро: для чыстых дзіцячых душ яно арганічнае, яны на яго скіраваныя. Можа, таму для іх зрабілі «мяккі» варыянт «Бармалея» — каб не напалохаў, не адштурхнуў. Але сама опера «Айбаліт» пры ўсёй вонкавай «цацачнасці» патрабуе засяроджанасці. І ад дзяцей, і ад дарослых. Проста каб зламыснік-Бармалей перавыхаваўся, трэба прыкласці намаганні. А мы цяпер такія нецярплівыя, хочам усяго і адразу. Вось і выхаванне дзяцей праз оперу — справа не аднаго дня. Не аднаго спектакля. Цудоўна, што ёсць магчымасць у Вялікім тэатры ставіць беларускія творы для дзяцей. Няхай іх будзе больш — на розны ўзрост. Каб са сталеннем не гублялася звычка хадзіць у оперу.

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*



КІНО ЯК ПРАВАДНІК МІФАЛАГІЧНАГА КОДА НАЦЫІ

Глядзім чарговую карціну з Нацыянальнага конкурсу

Фільм «Хранатоп», што складаецца з некалькіх частак, быў створаны аднайменнай арт-групай пад кіраўніцтвам Андрэя Кудзіненкі. Некалькі эпізодаў — некалькі аўтараў, некалькі поглядаў, некалькі вобразаў. 11 і 12 лістапада карціна будзе паказана на XXII Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад»; праект арт-групы «Хранатоп» стаў удзельнікам Нацыянальнага конкурсу побач з 34 іншымі поўнаметражнымі, кароткаметражнымі, іграўымі, дакументальнымі і анімацыйнымі работамі. Гэта адзін з тых фільмаў, што да конкурснага лістападаўскага паказу аказаўся адзначаным іншымі фестывалямі.

«Хранатоп» абмяркоўваўся яшчэ на стадыі свайго стварэння, ідэя зрабіць «твітар-серыял», як яго называў куратар праекта Андрэй Кудзіненка, падалася цікавай. Такім жа аказаўся вынік, пра які загаварылі яшчэ больш, калі стала вядома пра галоўны прыз праграмы «Амнібус» на расійскім кінафестывалі «Кінашок». Потым праект паказалі ў пазаконкурснай праграме кінафестывалю «Бульбамуві». Яго арганізатар Януш Гаўрылюк таксама датычны да стварэння «Хранатопа», як і беларускія творцы Аляксандр Дзепалеў, Мікалай Князеў, Раман Капанюк і іншыя.

У праект уваходзяць сем навел па 5-7 хвілін. Гэты фармат добра ўпісваецца ў сучаснасць, дзе інтэрнэт-прастора ўздзейнічае на мысленне грамадства і запаўняе сабой жыццё. Кароткія жанры, сцісłыя выказванні, ролікі на Youtube, сэрвісы Twitter і Instagram выхавалі нецярплівых «спажыўцоў», якія ўвесь час рвуцца да наступнага здольнага зачапіць слова, кадра, да шматзначнасці і кароткасці. Вядома ж, «Хранатоп» — не першы кінапраект, што складаецца з некалькіх навел. Можна ўзгадаць з апошніх альманахі «Парыж, я люблю цябе» (і падобныя) ці «Нью-Ёркскія гісторыі», «У кожнага сваё кіно», «На дзесяць хвілін старэйшы», «Чатыры пакоі», «Кава і цыгарэты» Джыма Джармуша альбо «Апавяданні» Міхаіла Сегала і «Дзікія гісторыі» Даміана Сіфрона.

Эпізоды «Хранатопа» не аб'яднаны агульнай стылістыкай (хаця б таму, што аўтары розныя), тым і цікавыя — прадстаўленнем некалькіх розных рэжысёрскіх фантазій з адным умоўным абагульненнем — гэтыя эпізоды датычныя сучаснай міфалогіі.

Складана раскрыць сутнасць гэтага паняцця: сучасная міфалогія хаваецца ў чалавечых падспудных памкненнях, відавочных праявах і, вядома ж, як і ўсё сучаснае, мае сваю глебу і сваю гісторыю. Беларусы, як заўважаюць некаторыя асабліва назіральныя людзі, у нечым засталіся язычнікамі. У гэтым спалучэнні язычніцтва і хрысціянства здольная выявіцца наша выключнасць, на гэтай аснове мусіць вызначыцца і этнічная асаблівасць нацыі. Па альманаху «Хранатоп» глядач не назаве глыбінных, традыцыйных, выхаваных стагоддзямі рыс беларускага характару, не зможа выкрыць яго дакладныя якасці, але заўважыць нейкі няўлоўны след, асцярожны пошук датычнасці да беларускасці, уласнае аўтарскае назіранне.

Тут можна ўбачыць міфічных істот — лясных німфаў, што кружаць галовы двум мужчынам; можна пачуць малітвы і размовы з Богам, спевы на провадзінах душы ў іншы свет, разгледзець магічны сэнс у малюнках аголенай жаночай натуры.

Асобныя каларытныя эпізоды хочацца пасмакаваць. З такога «Хранатоп» пачынаецца. Прадугледжваецца ўмоўны лятальны зыход, умоўны труп, умоўны былы мужчына Сідар. Дзве рэальныя жанчыны сядзяць у хаце каля «цела» і размаўляюць па-беларуску: «Ну што ты сядзіш, хоць паплач, хоць нябожчыку прыемна будзе» — «А хто ён мне? Чужы чалавек» — «Чужы не чужы, а пакрываў спраўна раз на тыдзень, калі я ў царкву хадзіла». Эпізод увогуле так па-прасцецку, па-вясковаму шчыры і бесцэнзурны. Такая манера нам — беларусам — знаёмая, нешта ў гэтай непрыкрытасці дакладна ёсць, мабыць, блізкае і ў той жа час дзіўнае да стрыманага смеху. Да дзвюх жанчын нечакана далучаецца яшчэ адна, а потым яшчэ адна — і вось яна, гендарная праблема. Адзін мужык быў на ўсю вёску (і на такіх пікантных жанчын) — і той памёр. Калі верыць ілюзіі. У гэтай навеле мне якраз бачыцца нешта язычніцкае, а можа, крыху і дэманічнае ў жаночай натуры. Чатыры жанчыны ў вёсцы — гэта ўвогуле агонь, «ім, дурным, трэба цяпер здружыцца».

Яшчэ адзін эпізод звязаны з паміранне умоўнага персанажа, на гэты раз без імя. У статычным плане мы бачым карціну, падобную да «Тайнай вячэры» (можа, у гэтым разгадка яе сэнсу) — за вялікім сталом у цэнтры сядзіць жанчына, з абодвух бакоў мужчыны. Віно і празрысты алкаголь на стале. Наліваюць, кладуць на адзін кілішак кавалак хлеба. І зноў эпізод сумяшчае радасць і трагедыю, што можа здацца жыццесцвярджальным, але не ў гэтым выпадку. Танец жанчыны ў змрочным пакоі больш нагадвае рытуал; нецвярозая шалёнасць мужчын, што перанялі ў яе эстафету, нагадвае тое, у што звычайна пераўтвараюцца сустрэчы вялікай колькасці людзей (славян). Усе заснулі, апроч галоўнай гераіні, што гучна і надрыўна смяецца. Для яе вечар яшчэ не скончаны...

Навелы «Хранатопа» не аб'яднаны агульнай стылістыкай (хаця б таму, што аўтары розныя), тым і цікавыя — прадстаўленнем некалькіх розных аўтарскіх фантазій з адным умоўным абагульненнем.

...Да невысокага абрыву пад'язджае машына. Адзін персанаж скідвае другога ўніз і, трымаючы ў руках пісталет (час ад часу прыстаўляючы яго да сябе), прыгаворвае нешта накшталт «я цябе з дзяцінства ведаю, а ты пацаноў кінуў». Вяршыць суд і караць вінаватага аказваецца не так лёгка, як гэта робіцца гангстарамі і мафіёзі ў замежных фільмах. Наш персанаж вагаецца, пакутуе і ніяк не можа адважыцца на крок, дзеля якога ён сюды прыехаў. Па законах крымінальнага свету трэба вырашаць усё хутка і бязлітасна, не пераключацца на эмоцыі, не праяўляць слабасці. Герой навелы не знаходзіць сіл на тое, каб трымацца негалосных законаў, і падае-садзіцца на зямлю, дастае бутэльку «Балантайнс» і прапануе свайму сябру апошняе жаданне. Той і выдае... І выжывае, таму што, акрамя бязлітаснасці, ён яшчэ і хітры.

Муж з жонкай сядзяць за сталом. На стале нож. На сцяне кілім, на якім напісана «Слава Союзу Советских Социалистических Республик». Глядзяць адно на аднаго. Муж бярэ нож і ідзе ў хлеў, адкуль чуецца парасячы віск. Справа зроблена, у жонкі з'явілася шмат працы, а муж... хоча павесіцца. Што і робіць. Традыцыйная ў нас форма адносін паміж свекрывёй і зяцем. «Мама» прыходзіць да дачкі, бачыць зяця на вяроўцы і прывабны кавалак мяса побач. Цягнецца па харч. Збіраецца ісці. Толькі акт павешання аказаўся фікцыяй (тлумачце, як хочаце) і зяць загаварыў...

Дзіўныя гэтыя сем эпізодаў. Тут радасць на трагедыі, дзе і трагедыя страчвае сваю эмацыйную моц, і радасць нейкая «абумоўленая», неабсалютная, магічная. Розныя тут аўтарскія падыходы, ёсць сіметрычная статычнасць і мітусня пры святле агню, гумар у стылі народных казак і невытлумачальная рашучасць з сыходам у містычнасць, няўмелыя малітвы за сябе і за роднага чалавека.

Трэба гэтыя сем эпізодаў паглядзець, каб знайсці сваё бачанне сучаснага фальклору.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Прэм'ера

ПЛАНЕТА ГЛЕБАВА

Балет «Маленькі прынц»: глядзець, каб слухаць

«...Усе дарослыя спачатку былі дзецьмі, толькі мала хто з іх пра гэта памятае».
Антуан дэ Сэнт-Экзюперы

Чаканая сенсацыя стала нечаканай вандроўкай разам з «Маленькім прынцам» у тыя гады, калі я сама з ім знаёмілася. Гэта пра балет Яўгена Глебава, створаны паводле Антуана дэ Сэнт-Экзюперы. Сенсацыя вось у чым: гэты балет, які абышоў розныя краіны, упершыню пастаўлены ў Беларусі. Так, у нашым Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета ў свой час ставіліся балеты Глебава: «Мара», «Альпійская балада», «Ціль Уленшпігель». А «Маленькаму прынцу» не пашчасціла адразу быць увасобленым на айчыннай сцэне, затое часта гучала музыка з балета — боская, зорная, нібыта гукі з іншай планеты заблукалі ў прасторы і спусціліся на Зямлю, як герой Экзюперы. І балет Глебава — твор такі ж лірычны, тонкі, прыгожы — вельмі адпавядае яго характару. Відаць, сапраўды, у кожным жыве свой Маленькі прынц. Як у Экзюперы, так і ў Глебаве. У дарослых, але мудрых людзях. Кожны з іх нёс у сабе мудрыя думкі, калі стваraў. А сапраўдная мудрасць — пазаўзроставая. Таму можа гучаць у такой форме, якую адчуюць усе.

«Маленькага прынца» мы калісьці чыталі ўсёй сям'ёй, разглядалі з татам малюнкі Экзюперы, потым з сястрой (хоць і былі ўжо не зусім малыя) малявалі баранчыкаў і капялюшыкі са слонікамі, ружы і Ружу, а тата тлумачыў, што кожнае стварэнне ў Сусвеце вельмі крохкае, таму яго трэба берагчы. Ад свайго таты я даведалася пра лётчыка Экзюперы. Ужо дарослай дазналася пра тое, як ён загінуў і калі нарадзіўся яго «Маленькі прынц»: была Другая сусветная вайна. Тады зоркі сышліся...

«Наведай планету Зямля... У яе нядрэнная рэпутацыя».

Удава кампазітара і аўтарка лібрэта балета, пастаўленага ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі, Ларыса Глебава лічыць:

— Я шчаслівая, што адбылося аднаўленне гістарычнай справядлівасці. Праз 33 гады пасля першай прэм'еры гэтага твора тэатр ставіць балет свайго кампазітара. Паварот да нацыянальнага мастацтва, да нацыянальнага твора — гэта вельмі актуальна ў наш час. Гэта менавіта тое, што можна назваць патрыятызмам.

У балета «Маленькі прынц» цікавы лёс. Уся сям'я Глебавых любіла гэты твор: Ларыса Аляксандраўна, як зацяты кнігалюб, старалася даставаць кніжкі Экзюперы, што выдаваліся ў СССР. Упадабаў яго і кампазітар, які доўга ў сабе выношваў мелодыі герояў.

— Калі ў Хельсінкі дазналіся, што ў Яўгена Аляксандравіча ёсць жаданне напісаць музыку, яны вельмі зацікавіліся, пагадзіліся ставіць і нават узялі на сябе абавязак знайсці нашчадкаў Экзюперы, спытаць у іх згоду на перапрацоўку твора з літаратурнага ў музычны, каб ажыццявіць пастаноўку легальна. Прэм'ера адбылася ў тэатры Суомі ў Хельсінкі. Потым балетам зацікавіўся Юрый Грыгаровіч з Вялікага тэатра Расіі, патэлефанаваў і спытаў, ці быў балет дзе-небудзь пастаўлены? Яўген кажа: «Я вымушаны вас засмуціць...» — «Хельсінкі мяне не цікавяць, галоўнае, каб у Савецкім Саюзе мы былі першымі».

«Калі любіш кветку — адзіную, якой больш няма ні на адной са шматлікіх мільёнаў зорак, — гэтага досыць: глядзіш на неба — і ты шчаслівы».

— Калі Яўген Аляксандравіч атрымаў «добра» з Хельсінкі, мы селі і распрацавалі план, якія часткі будуць узятыя з самой казкі, — тлумачыць Ларыса Аляксандраўна. — А калі ўжо справа наблізілася да прэм'еры, тады я зрабіла літапрацоўку. А другі раз я гэта зрабіла ўжо для Масквы. Таму што ў Хельсінкі Маленькіх прынцаў танцавалі дзеці, 9-гадовыя хлопчыкі. Гэта было асабліва кранальна, у многіх з'яўляліся слёзы на вачах. У Маскве ў харэографа Генрыха Маёрава быў абсалютна іншы падыход. У 1983 годзе адбылася прэм'ера. Затым балет пайшоў па іншых тэатрах Савецкага Саюза. Але ў Мінску дагэтуль пастаўлены не быў.

Кожная новая пастаноўка — абсалютна іншы твор. У кожнага харэографа свой погляд, розныя адносіны да таго, пра што гаворка. Таму для кожнага спектакля мне прыходзілася рабіць лібрэта — дадаваць нейкі нюанс, нешта мяняць. А вось гэты наш варыянт, дзякуючы балетмайстару-пастаноўшчыку Аляксандры Уладзіміраўне Ціхамiравай, мы перапрацавалі істотна. Калі браць усю канцэпцыю спектакля, то грунтаваліся на тым, што адбываецца ў свеце, у той час, у які мы цяпер жывём. Для гэтага спатрэбілася ўмяшанне музыкі Глебава, якая не мае каранёў у самім балеце «Маленькі прынц», з іншага твора, але гэта вельмі арганічна, далікатна і прафесійна зрабіў кампазітар Дзмітрый Даўгалёў, які быў вучнем Яўгена Глебава. Я хацела б падкрэсліць, што Яўген Аляксандравіч вельмі адказна ставіўся да таго, як яго музыка будзе выконвацца: было важна ўсё, ад першай да апошняй ноты. Для яго заўсёды на першым месцы быў прафесіяналізм ва ўсім. Шкада, што ён не дажыў да гэтай прэм'еры.

«Падняўся ранкам, умыўся, прывёў у парадак сябе — і адразу ж прывядзі ў парадак сваю планету».

Планета — гэта сімвал не толькі радзімы Маленькага прынца. Гэта наогул галоўны сімвал і сэнс гэтай гісторыі. Пастаноўшчыкі пастараліся ўвасобіць яго — перш за ўсё ў сцэнічным афармленні (над гэтым працаваў мастак-пастаноўшчык Вячаслаў Окунеў). Бясконцасць сусветнай прасторы з безліччу планет атрымалася перадаць дзякуючы відэапраекцыі (праца Вікторыі Злотнікавай з Расіі). Таксама як і перанесціся ў Парыж, дзе адбывалася гісторыя Лётчыка і Каханай. Але веліч Эйфелевай вежы пахіснулася, малюнкі Экзюперы гараць у агні. Зразумела, чаму ён потым аказваецца ў пустыні адзін, і толькі мудры Ліхтаршчык там запальвае зоркі. На адной з іх, магчыма, ёсць істоты шчырыя, без зайздрасці і падступства, без злосці і жадання ўсю глебу засеяць цёмным насеннем. Там той, хто чысты сэрцам, можа жыць шчаслівa. Можа жыць.

— Для тэатра проста пераказванне сюжэта было б справай няўдзячнай, — гаворыць балетмайстар Аляксандра Ціхамірава. — Таму што казка складаная, для дарослых, і ўсе праблемы псіхалагічныя, схаванныя. У казцы няма адкрытага канфлікту, але любое тэатральнае дзеянне прадугледжвае яго, інакш дзеля чаго ўсё? Мы кожны радок гэтай кніжкі абмяркоўвалі. Хто такі Маленькі прынц? Было цікава прааналізаваць постаць самога лётчыка. Хто такая Кансуэла, каханая аўтара? А як увасабляецца Ружа?..

«Ты назаўсёды адказны за тых, каго прыручыў. Ты адказны за сваю ружу».

У гэтым балеце без алегорый было б немагчыма. Сам Маленькі прынц — гэта алегорыя, прапанаваная Экзюперы. Таксама, як і Ружа. Іх адносіны — жывыя. Спачатку жывыя — а потым ужо чалавечыя, таму што яшчэ невядома, хто істота больш высокага парадку. Ва ўсім гэтым творы (казка — гэта, здаецца, тут не столькі жанр, колькі брама да алегарычнасці) істот безліч, а чалавечае часам немагчыма суаднесці са стасункамі паміж людзьмі. Людзі могуць быць жорсткімі, грэблівымі, ганарлівымі, сквапнымі — і што тады ў гэтым чалавечага? Таму ўсе вобразы — азначэнні абстрактных паняццяў, якія носіш у сваёй свядомасці: некаторыя культывуеш у сабе, некаторыя імкнешся вынішчыць. Візуальны сцэнічны вобраз схіляе да абстракцыі (напачатку) — ты ды яе гатовы. Да таго, што людзі будуць кантактаваць з рознымі істотамі, істоты гэтыя — больш характары, сутнасці, чым баабабы, мышкі, лісы, кветкі (у балеце кожны характар павінен пазнавацца праз малюнак харэаграфічнай партыі). Але нам паказваюць іх пазнавальнымі, а часам наогул літаральна (напрыклад, мышкі ў плюшавых касцюмчыках). З абстрактнай планеты ў бязмежным Сусвеце, на якую ты нібыта трапляеш напачатку, цябе ўсё ж цягнуць у казку з забаўнымі героямі, ад чаго прастора Чалавека як увасаблення Сусвету звужаецца. І прынц тут — чароўны і сапраўды маленькі прынц (а не чароўны чалавек).

«Людзі? Ах так... Іх усяго, здаецца, шэсць ці сем. Я іх бачыў шмат гадоў таму. Але дзе іх шукаць — невядома. Іх носіць ветрам. У іх няма каранёў, гэта вельмі нязручна».

Аднак алегарычныя вобразы нараджае музыка, калі яе проста слухаеш. Яна прывязаная да каранёў твора, паводле якога створаная. Але ў кожнага (як і ў пастаноўшчыкаў) можа быць свой Экзюперы і свая ступень алегарычнасці — у залежнасці ад каранёў, з якіх ідзе іх разуменне жыцця. Чалавечага ці жывога. Хто захоча бачыць казку, той будзе сачыць за сюжэтам, дзе героі змяняюць адзін аднаго; хто захоча адчуць сэнс, той будзе стварацьасаблівыя алегорыі паводле гэтага балета, будзе ўяўляць, як маглі б рухацца і жыць усе вобразы адсюль. І пачне ў думках будаваць сваю карціну свету Маленькага прынца, які жыве ў кожным з нас. Калі заплюшчыць вочы, то музыка дае тую ступень абстракцыі, за якой адкрываецца прыгожы і тонкі сэнс жыцця Маленькага прынца.

«Мне здавалася нават, нічога больш крохкага няма на нашай Зямлі. Пры святле месяца я глядзеў на яго бледны лоб, сплюшчаныя вейкі, на залатыя пасмы валасоў, якія перабіраў вецер, і казаў сабе: усё гэта толькі абалонка. Самае галоўнае — тое, чаго не ўбачыш вачыма...»

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

«ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎСКАЯ, СВЯТАЯ»

Па гарызанталі: 1. Назва сельскага аднадворовага адасобленага паселішча; падобныя на ... існавалі на Беларусі і водрубы. **9.** Невялікая рака, прыток Пцічы; па адной з версій, назва г. Мінска паходзіць ад назвы гэтай ракі. **10.** ... даражэй за грошы (прык.). **11.** Драўляны брус, на які насцілаецца падлога. **13.** Зямельнае ўладанне памешчыка з панскай гаспадаркай. **14.** Вёска на Астравеччыне; назва яе такая ж самая, як і назва краіны ў Заходняй Афрыцы. **17.** Гандлёвы знак, тып вырабу тавару.**18.** Сузор'е. **19.** «Бяры ... залатое,\\ Сядлай каня варанога». З валачобнай песні. **20.** Твор антычнай скульптуры. **21.** Арганічнае злучэнне, якое змяшчае кісларод. **22.** Горад на Віцебшчыне, непадалёку ад якога знаходзіцца вёска Парыж. **26.** Планета сонечнай сістэмы; з такой жа назвай ёсць вёскі ў Дзяржынскім і Лоеўскім раёнах. **29.** Гара ў Грэцыі, на якой, паводле міфаў, жылі музы. **30.** У старажытныя часы (XII—XVI стагоддзі) складаная частка буйных вялікіх княстваў. **31.** Аблога.

Па вертыкалі: 1. Паўвостраў на поўначы Заходняй Сібіры, які «скардзіцца» на сваю вялічыню. **2.** Месца, у якое з цягам часу марыць трапіць кожны чалавек; такую ж назву мае вёска ў Сенненскім раёне, што на Віцебшчыне. **3.** Даўняя назва прадпрыемства па вырабе шкла; слова ... сустракаецца ў назвах 26 населеных пунктаў Беларусі. **4.** Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка. **5.** «Тапаніміка — ... Зямлі». Цытата рускага вучонага М.Надзеждзіна. **7.** Установа, арганізацыя. **8.** Зараснік ракіты. **12.** Месца, дзе захаваліся рэшткі старажытнага пасялення; такую назву мае на Беларусі 31 населены пункт. **15.** «Зямля бацькоўская святая,\\ Так, гэта мы. Увесь ...». З верша П. Панчанкі «Зямля бацькоў». **16.** Назва гандлёва-рамеснай часткі старажытнага горада. **17.** Невялікі населены пункт, які вылучаўся гандлем і рамяством. **23.** Прыстасаванне, дзе распальваюць агонь. **24.** Парусінавая стрэшка, якая засцярагае ад сонца, дажджу. **25.** Старажытнаславянская назва вёскі. **27.** Вялікая вёска; даўней так называлі паселішча з царквой або з касцёлам. **28.** Даўняя назва месца на беразе ракі, дзе вяжуць плыты; такую назву мае вёска ў Валожынскім раёне.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 6. Хутар. **9.** Мекка. **10.** Уладар. **11.** Лага. **13.** Маёнтак. **14.** Маці. **17.** Марка. **18.** Арбіта. **19.** Сядло. **20.** Антык. **21.** Эфір. **22.** Пастаўшчык. **26.** Марс. **29.** Парнас. **30.** Удзел. **31.** Асада.

Па вертыкалі: 1. Паўвостраў. **2.** Рай. **3.** Гута. **4.** Рабін. **5.** Мова. **7.** Таварыства. **8.** Рэктарат. **12.** Гарадзішча. **15.** Народ. **16.** Пасад. **17.** Мастачка. **23.** Агаг. **24.** Тэнт. **25.** Весь. **27.** Сяло. **28.** Рум.

■ Песню бярыце з сабою



Явар і каліна

Святланосныя грамадзянска-патрыятычныя задумы Юрыя Уладзіміравіча панарамна разгарнуліся ў буйных творах, у аснову якіх пакладзена нацыянальная літаратурная класіка. У оперы «Зорка Венера» ўпершыню ў гісторыі беларускай культуры створаны музычны вобраз рэальнага паэта — Максіма Багдановіча. Лёс народа шырока пададзены ў оперы «Новая зямля», напісанай паводле паэмы Якуба Коласа.

Плённа адлюстравалася захапленне Юрыя Семянякі творчасцю народнага паэта Янкі Купалы. Кампазітар зрабіў музычнае афармленне тэлеспектакля «Прымакі», з любасцю працаваў над камедыяй «Паўлінка». А песня «Явар і каліна» ўвайшла ў залаты фонд беларускай музыкі, фальклярызавалася. Яе разам з песнямі «Спадчына» І. Лучанка, «Шумныя бярозы» Р. Пукста, «Малітва» А. Молчана, створанымі на вершы нацыянальнага Прарока, мусіць ведаць кожны беларус, калі ён свята жадае, каб родная Беларусь па-сапраўднаму разнаколерна квітнела і шматгалоса ў суладдзі красавалася.

Верш Янкі Купалы Музыка Юрыя Семянякі

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай,
Росамі мыюцца раніцай,
Песяцца сонцам паўднёвым.

Чуецца музыка дзіўная
Ў повесцях сонных імшараў.
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Зімітрок, Зміцер, Дзімітрыеў дзень, Дзмітры — 8 лістапада.

Па праваслаўным календары ў гэты дзень узгадваецца вялікапакутнік Дзімітрый Салунскі, адураваны рымскі воін-стратэг, які загінуў за ідэі хрысціянства. Ва ўсходніх славян яго звязвалі з воінскім, ратным подзвігам.

◈ На працягу тыдня, на які прыпадае Дзімітрыеў дзень, у храмах ладзяцца памінальныя набажэнствы. Змітраўскі тыдзень стаў насіць назву бацькоўскі, або дзедаў, таму і Дзяды.

◈ На Беларусі здавён існавала народнае прадзначаць Змітраўскія, ці асеннія Дзяды ў трэцюю суботу пасля Пакравоў (апошнюю перад 8 лістапада). У некаторых рэгіёнах (напрыклад, Ашмянскім павеце) у дарэвалюцыйны час этнографы засведчылі, што «першыя Дзяды адзначалі ў чацвер на Змітраўскім тыдні, другія — у суботу, трэція — у нядзелю, а чацвёртыя — у суботу перад загавінамі (27.11.)».

◈ Змітраўскую памінальную, бацькоўскую суботу заўсёды праводзілі ўрачыста: хадзілі на магілы сваякоў, служылі паніхіды, накрывалі жалобныя сталы, дзе не абыходзілася без галашэнняў.

◈ У гэты дзень забаранялася выконваць усялякую цяжкую фізічную ці якую б то ні было «брудную» работу: «На Змітра не пралі, не ткалі і ў полі не працавалі».

◈ А яшчэ ў гэты дзень пільна назіралі за надвор'ем:

калі «адпачнуць» на Дзедавым тыдні бацькі (калі будзе цёпла), то і ўся зіма будзе з адлігамі;

калі Дзмітрыеў дзень будзе «па голу» (без снегу), то і Вялікдзень будзе цёплым, а калі Дзмітрыева субота са снегам, то і Святая (Вялікдзень) са снегам;

дзімітрый на снезе — вясна позняя;

калі на Змітрака холад і снег, вясна позняя і халодная, а калі адліга — вясна і зіма цёплыя;

калі Зміцер на снезе, то і Каляды на снезе;

◈ Змітрок па снегу — і Вялікдзень па снегу, Змітрок па голу — і Вялікдзень таксама.

Даты Падзеі Людзі

7 ЛІСТАПАДА

1790 год — нарадзіўся (вёска Жырмуны, цяпер Воранаўскі раён) Карл Іванавіч Падчашынскі, беларускі архітэктар і педагог. Прадстаўнік стылю класіцызму. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, у Італіі і Парыжы. Працаваў у Беларусі, Літве і Польшчы. Паводле яго праектаў у Беларусі пабудаваны Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль, вучылішчы ў Бабруйску і Мазыры, гімназіі ў пасёлку Свіслач і ў Слуцку. Аўтар 3-томнай працы «Пачатак архітэктуры». Памёр у 1860 годзе.

1879 год — нарадзіўся Троцкі (Бранштэйн) Леў Давыдавіч, расійскі палітычны дзеяч. З верасня 1917-га — старшыня Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, адзін з кіраўнікоў Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. У 1917-1918 гг. — наркам замежных спраў РСФСР, у 1918-1925-м — наркам па ваенных і марскіх справах, старшыня Рэўваенсавета СССР. Адзін са стваральнікаў рэгулярнай Чырвонай Арміі. У 1929 годзе высланы за мяжу, у 1932-м пазбаўлены савецкага грамадзянства. Жыў у Турцыі, затым у Мексіцы. Быў ініцыятарам стварэння «Чацвёртага інтэрнацыянала» (1938). Аўтар прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Расіі, літаратурна-крытычных артыкулаў, успамінаў «Маё жыццё». Забіты агентам НКУС.

1941 год — адбыўся парад савецкіх войскаў на Краснай плошчы ў Маскве, які быў прыраўнаваны да найважнейшай баявой аперацыі. Менавіта на гэты дзень з нагоды запланаванага захопу Масквы гітлераўскім камандаваннем прызначана ўрачыстае праходжанне па Краснай плошчы войскаў вермахта. Таму савецкі ваенны парад у гонар 24-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі было вырашана правесці з асаблівай урачыстасцю — для ўмацавання маральнага духу народа і арміі. Гэта была пераканаўчая магчымасць заявіць на ўвесь свет аб тым, што Масква стаіць і будзе цвёрда стаяць. 6 лістапада, адразу ж пасля ўрачыстага пасяджэння, якое адбылося на станцыі метро «Маякоўская», Сталін абвясціў членам Палітбюро ЦК, сакратарам МК і МГК пра час пачатку параду войскаў на Краснай плошчы. Камандзірам часцей, якія павінны былі ўдзельнічаць у парадзе, пра гэта стала вядома ў 23 гадзіны, а прадстаўнікам працоўных калектываў, якія былі запрошаны на парад, паведамлялі аб правядзенні ўрачыстасці з пяці гадзін раніцы 7 лістапада. З 5 лістапада савецкія Ваенна-Паветраныя Сілы наносілі папераджальныя ўдары па аэрадромах ворага, і ў святочны дзень на Маскву не было скінута ніводнай бомбы. У ноч на 7 лістапада па ўказанні Сталіна расчахлілі крамлёўскія зоркі, ад маскіроўкі вызвалены маўзалея Леніна. Парад пачаўся роўна а 8-й гадзіне раніцы. На трыбунах па абодва бакі маўзалею, акрамя рабочых і служачых, знаходзіліся акрэдытаваныя ў сталіцы карэспандэнты замежных газет. Так што вестка аб парадзе разнеслася па ўсім свеце. Між тым 6 і 7 лістапада 1941 года савецкае камандаванне спланавала і ажыццявілі шэраг моцных удараў па ворагу на Мажайскім, Валакаламскім і Малаяраславецкім напрамках. Проста з парада на галоўнай плошчы краіны байцы Чырвонай Арміі адпраўляліся на фронт, да якога ад цэнтра Масквы было ўсяго некалькі кіламетраў.

Было сказана

Пімен ПАНЧАНКА, народны паэт Беларусі:

«І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты,
І ў спёку пекане цябе зіма».

■ Добрая навіна

МІНСК СТАЎ БЛІЖЭЙ

Першы цягнік гарадскіх ліній пачаў курсіраваць са сталіцы ў Смалявічы 6 лістапада. У гэты дзень ён зрабіў два рэйсы.

А ўжо 7 лістапада цягнікі гарадскіх ліній пачнуць хадзіць у горад-спадарожнік тройчы. Час адпраўлення са сталіцы ў 7.57, 13.10 і 18.18. Са Смалявіч будзе 4 рэйсы. Першы — у 6.18, прыбыццё ў Мінск — 6.59.

Бясспрэчна, такая навіна парадавала жыхароў райцэнтра, якім цяпер стане зручней дабірацца на работу ў сталіцу.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

СЕТЬ МАГАЗИНОВ КРОНОС ПРЯМЫХ ПОСТАВОК
НАШИ МАГАЗИНЫ:
• г. МИНСК, ул. Боровая, 1 Территория ТВЦ "Аквабел"
• Брестская обл., д. Пески-1 (трасса М1-Е30)
ЗВОНИТЕ ПРЯМО СЕЙЧАС!
+375 (33) 391 96 30
+375 (44) 712 12 03
ВКАЛЫВАЕТЕ?
УСТАЛИ ПЕРЕКАПЫВАТЬ ЛОПАТОЙ?
ЕСТЬ ОТЛИЧНОЕ РЕШЕНИЕ ПРОБЛЕМ!
МОТОБЛОК КЕНТАВР 2080Б
+3 ПОДАРКА
• Японский бензиновый двигатель КАМА
• Вал отбора мощности
• Экономичный
• Передачи: 2 вперед / 1 назад
• 2 года расширенной гарантии
KRONOS5.BY
СВИД. ВЫДАНО МИНСКИМ РАЙИСПОЛКОМОМ 6.11.2014 г. ООО "КРОНЕР" УНП 192372716
6 ПРИЧИН КУПИТЬ В КРОНОС
100% гарантия возврата денег | Цена от первого поставщика | Выездной сервисный центр | Быстрый кредит по телефону и беспроцентная рассрочка | Бесплатная предпродажная подготовка и тестовая обкатка | Бесплатная доставка до порога

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЧАСТУЙЦЕСЯ!

Дэсерты з яблыкаў

Яблычна-тварожная фантазія



Спатрэбіцца: *рыс — 250 г, малако — 1 л, яблыкі — 400 г, тварог — 250 г, масла — 50 г, яйка — 4 шт., цукар — 100 г, лімон, карыца, манка.*

Рыс трэба зварыць у малацэ. А пакуль ён гатуецца, наразаем яблыкі, дабаўляем у іх лімонны сок і карыцу. Асобна змешваем тварог з маслам, узбітымі яйкамі, цукрам і лімоннай цэдрай. Злучаем тварог з рысавай кашай. Змазваем маслам форму для запякання, пасыпаем яе манкай, выліваем падрыхтаваную масу, зверху размяркоўваем здробненую садавіну і пасыпаем цукрам. Запякаем дэсерт у духоўцы 35 хвілін пры тэмпературы 180 °С.

Яблыкі на паветранай пярыне

Спатрэбіцца: *яблыкі — 3 шт., яйкі — 3 шт., цукар — 150 г, мука — 200 г, масла — 50 г, разрыхляльнік — 1 ч. л., дробка солі, ванілін.*

Яблыкі рэжам буйнымі кавалачкамі. Бялкі з трох яек узбіваем у моцную пену, паступова дабаўляем цукар, жаўткі, растопленае масла і ў тры пальцы ванілі. Затым паступова падсыпаем муку, разрыхляльнік і ў тры пальцы солі. Змазваем форму для запякання алеем і выкладваем палову цеста. Зверху высыпаем яблыкі і закрываем іх другой паловай цеста. Запякаем 20-25 хвілін пры тэмпературы 180 °С. Галоўнае — не адчыняць духоўку раней, каб цеста не апала.

Салодкае яблычнае сэрца

Спатрэбіцца: *яблыкі — 6 шт., аўсяныя шматкі — 3 ст. л., фінікі — 100 г, масла — 30 г, цукар, карыца.*

Бярэм некалькі яблыкаў, зразаем верх, выразаем мякаць, каб атрымаліся «збанкі». Дробна наразаем яблычную мякаць і змешваем яе з аўсянымі шматкамі, здробненымі фінікамі, карыцай і цукрам на смак. Начыняем гэтай сумессю яблычныя «збанкі», кладзем зверху кожнага па кавалачку масла і запякаем у духоўцы 15-20 хвілін пры тэмпературы 180 °С. Такі дэсерт з печаных яблыкаў — выдатная альтэрнатыва каларыйнай выпечцы.

Яблычна-гарбузовы дуэт

Спатрэбіцца: *яблыкі — 4 шт., масла — 20 г, гарбуз, ёгурт — 200 г, жэлацін — 10 г, мёд — 50 г, карыца, тлустыя вяршкі — 100 г.*

Яблыкі рэжам лустачкамі і тушым у масле пяць хвілін. Калі яны дадуць сок, дадаем карыцу і большую частку мёду. Наразаем гарбуз кубікамі, дабаўляем да яблыкаў і тушым, пакуль ён не размякчыцца. Гатовую сумесь астуджаем, пераліваем у блендар, дабаўляем ёгурт і ўзбіваем у аднастайную масу. Затым уводзім распушчаны ў вадзе жэлацін і мёд. Зноў узбіваем масу. Разліваем па крэманках або кактэйльных шклянках і ўпрыгожваем узбітымі вяршкамі.

ЗАКОНЫ СТЫЛЮ

Міфы аб жаночых упрыгажэннях



Міф першы. Біжутэрыя падыходзіць толькі маладым дзяўчатам.

Біжутэрыя ад біжутэрыі адрозніваецца. Так, калі вы юныя, на вас добра будзе глядзецца і капеечны кулон. Але калі вы перасягнулі парог трыццацігоддзя, то варта звярнуць увагу не толькі на каштоўнасці, але і на дарагую біжутэрыю. Галоўнае, каб яна гарманічна спалучалася з адзеннем і астатнімі рысамі вашага стылю.

Міф другі. Нельга спалучаць біжутэрыю з каштоўнымі камянямі і металамі або золата з серабром.

Можна прытрымлівацца гэтага правіла, калі вы ідзяце на нейкае элітнае мерапрыемства. Але ў іншых выпадках можна ўпрыгожыць сябе ў больш свабодным стылі. Дапусцім, надзець залатыя завушніцы, залаты ланцужок, сярэбраны ланцужок і кулон з біжутэрыі. Пярсцёнкі наогул могуць быць выкананы з розных матэрыялаў, галоўнае — каб хаця б адзін з іх спалучаўся з астатнімі ўпрыгажэннямі. Калі ў вас залатыя завушніцы — хай хаця б адзін з пярсцёнкаў будзе з золата. Калі на вас надзеты сярэбраны ланцужок — хоць адзін пярсцёнак павінен быць з серабра.

Міф трэці. Нельга насіць некалькі падобных упрыгажэнняў адначасова

Гледзячы якіх. Калі вы надзелі на шыю кулон або ланцужок, то надзетыя зверху пацеркі толькі дапоўняць вобраз. Калі ланцужкі розныя па дызайне, яны таксама адзін аднаму не перашкодзяць. А вось калі вы начапілі пацеркі або калье розных колераў і дызайну, гэта можа выглядаць безгустоўна. Пярсцёнкаў на пальцах таксама можа быць некалькі. Але пажадана, каб яны гарманіравалі адзін з адным, а таксама з вашым адзеннем і астатнімі ўпрыгажэннямі. Тое ж і з бранзалетамі.

Міф чацвёрты. Буйныя ўпрыгажэнні не падыходзяць поўным, а дробныя — худым.

Наадварот. Масіўныя завушніцы адцягнуць увагу ад вашай поўнай таліі і пухлых шчок, а буйныя пацеркі схаваюць тлушчавыя складкі на шыі. А вось тонкія ланцужкі, кулоны, завушніцы і пярсцёнкі з невялікімі камянямі толькі падкрэсляць зграбнасць і вытанчанасць, дапоўняць імідж «худышкі». Худзенькая дзяўчына ў залішне масіўных упрыгажэннях можа глядзецца проста камічна, не кажучы ўжо пра тое, што гэта будзе яе старыць.

Міф пяты. Нельга спалучаць буйныя і дробныя ўпрыгажэнні.

«Асноўны» камплект лепш надзяваць аднаго калібру. Але калі на вас ужо надзета некалькі рознакаліберных ланцужкоў і кулонаў, то можаце дазволіць сабе, скажам, надзець завушніцы з буйнымі камянямі і пярсцёнак з дробным каменьчыкам. Ролю тут адыгрывае спалучальнасць колераў і афармлення, а зусім не памеры.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.20	17.25	9.05
Віцебск	8.15	17.10	8.55
Магілёў	8.11	17.15	9.04
Гомель	8.02	17.17	9.15
Гродна	8.35	17.41	9.06
Брэст	8.30	17.47	9.17

Месяц

Маладзік 11 лістапада.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Настассі, Маркіяна.*

К. *Алены, Карыны, Антонія, Зыгмунта, Эрнэста.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+9..+11°С	КІЕЎ	+6..+8°С	РЫГА	+8..+10°С
ВІЛЬНЮС	+10..+12°С	МАСКВА	+1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+6..+8°С

УСМІХНЕМСЯ

Маладая жанчына катае каля дома ў калясцы дзіця. Да яе падыходзіць знаёмая і кажа:

— Ну трэба ж, як дзве кроплі вады падобны на твайго мужа!

Першая (задуменна):

— Гэта суседка з трэцяга паверха прасіла мяне пагуляць з яе дзіцем...

Кожны дзень я займаюся нерухомасцю. Ляжу і не рухаюся.

— Дарагі, я сёння ўся на нервах, не пытайся чаму.

— Добра.

— Вось табе заўсёды было ўсё роўна!

carlcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларусь Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4479.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 лістапада 2015 года.